

ЗЯЛЁНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ НАВАГРУДКА **7**



ЗАПЛАНАВАНАЕ СТАРЭННЕ ТЭХНІКІ **10**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 112 (28979)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Чым больш сталай становіцца беларуска-расійская інтэграцыя, тым больш патрабавальным становіцца грамадскі запыт на яе паглыбленне, рашэнне праблем, якія тармозяць развіццё эканомікі. Палітыка нацыянальнага пратэкцыянізму не дазваляе эфектыўна вырашаць задачы па стварэнні роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання, пераадоленні бар'ераў ва ўзаемным гандлі, правядзенні ўзгодненай прамысловай і аграрнай палітыкі. Кіраўнікі дзвюх дзяржаў далі даручэнне ўрадам да 21 чэрвеня знайсці агульныя падыходы па ўсіх адчувальных пытаннях і ўнесці адпаведныя прапановы. Саюзныя парламентарыі не павінны заставацца ўбаку ад гэтага працэсу, тым больш што ў прыярытэтных кірунках Парламенцкаму сходу даручана выпрацоўка ўзгодненых рашэнняў па праблемах саюзнага будаўніцтва».*

## КОРАТКА

- Прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах аль-Сісі прыбыў учора з афіцыйным візітам у Беларусь.
- **Трох чалавек выдалілі за парушэнні з ЦТ па матэматыцы: двух — за шпаргалкі, аднаго — за мабільны тэлефон.**
- Салігорскія шахцёры знайшлі астанкі ракаскарпіёна, якім 350 мільёнаў гадоў.
- **Больш за 90 % тых, хто звярнуўся ў 2019 годзе па атрыманне статусу бежанца ў Беларусі, — жыхары Украіны.**
- У кітайскай правінцыі Гуйчжоу ўнутры карставай пячоры абсталявалі баскетбольную пляцоўку, каб сельскія жыхары маглі гуляць у баскетбол, нават калі на вуліцы ідзе дождж ці горача.

# НА П'ЕДЭСТАЛЕ — БРАТЫ МЕНШЫЯ



Мсціслаўскія сяброўкі Лізавета ЖЫГУНОВА і Анжаліка АСІПЕНКА са сваім чатырохлапым сябрам — маленькім лабрадорам Альфам — каля бронзавай фігуры лісяняці, устаноўленай на пешаходнай вуліцы старажытнага горада. Шчанюка падарылі Лізавеце на дзень нараджэння — нядаўна ёй споўнілася дзесяць гадоў, — а лісяня паставілі ў 2016 годзе перад абласнымі «Дажынкамі».

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Рэйд

## ТРАГЕДЫЯ АДНОЙ СЯМ'І І... МНОГІХ

**У прэсе часта ўздымаюцца праблемы сем'яў, дзе бацькі крыўдзяць дзяцей ці муж жонку. Але падчас апошняга рэйду я даведалася, што бывае інакш. Пра гэта стараюцца не казаць, толькі раз-пораз у крымінальнай зводцы сустрэнеш паведамленне аб тым, што дарослы сын ці дачка забілі бацьку ці маці. Але гэта ўжо трагічны вынік. Часта за такімі паведамленнямі хаваюцца доўгія гады пакут пажылых людзей — ад сораму, безвыходнасці і болю. Сорамна прызнацца, што ў сям'і ёсць такая праблема, балюча ад безвыходнасці і гвалту... І, канешне, страшна. Страшна, што вінаваціць будуць цябе, старога, за тое, што не здолеў выхаваць сваё дзіця дастойным.**

СТАР. 5



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Гасцёўня

## «ЕФРАСІННЯ ШАНАВАЛА ПАМЯЦЬ АБ ІМ ТАКІМ ЧЫНАМ»

### У Полацку ўпершыню знойдзена пахаванне князя



Фота www.psu.by

**На тэрыторыі Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ўжо не першы год вядуцца актыўныя археалагічныя даследаванні. Сярод знаходак — нямала сенсацый. Адна з іх — падземны храм. Так не хавалі ні ў кога з нашых суседзяў. Да таго ж маюцца ўсе падставы меркаваць, што гэта пахаванне... князя! Пра ўнікальныя фрэскі, пра шлем Ізяслава, пра тое, што можа і чаго пакуль не можа сабе дазволіць сучасная беларуская археалогія, карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з магістрам гістарычных навук, археолагам, старшым выкладчыкам кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксеем КОЦАМ *(на фота)*, які з'яўляецца адным з кіраўнікоў у гэтых знакавых раскопках.**

СТАР. 12

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе**

**Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!**

# «ПОЛЫМЯ МІРУ» ЎЖО Ў СТАЛІЦЫ

**Перад тым як апынуцца ў Мінску, эстафета агню II Еўрапейскіх гульняў пабывала на знакавых для беларускага народа месцах — «Лініі Сталіна» і Кургане Славы. Факеланосцамі там сталі генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі, беларускі асілак Кірыл Шымко, алімпійскія чэмпіёны Леанід Тараненка і Аляксей Грышын, заслужаныя артысткі Беларусі Алёна Ланская, Ірына Дарафеева і іншыя вядомыя асобы краіны.**



Учора агонь Гульняў сустрэлі ў Мінску, эстафета пачалася з плошчы Свабоды і пралягала па вуліцы Леніна, праспекце Пераможцаў, праз стэлу «Мінск — горад герой» да плошчы Дзяржаўнага сцяга, дзе і адбылася ўрачыстая цырымонія сустрэчы «Полымя міру» ў сталіцы. Сёння эстафета працягнецца, яна завітае ў Батанічны сад і Нацыянальны Акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Нагадаем, маршрут эстафеты завершыцца 21 чэрвеня на Нацыянальным алімпійскім стадыёне «Дынама» падчас цырымоніі адкрыцця II Еўрапейскіх гульняў.

**❍ У тэму**

Фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» і аргкамітэт Еўра-2020 (расійскай часткі чэмпіянату Еўропы па футболе) падпісалі ў Санкт-Пецярбургу пагадненне аб праграме валанцёрскага абмену. У рамках супрацоўніцтва найлепшыя валанцёры па выніках правядзення II Еўрапейскіх гульняў у Мінску адправяцца ў Санкт-Пецярбург для работы на Еўра-2020. Валанцёрская праграма юбілейнага чэмпіянату прадугледжвае работу ў 22 функцыянальных кірунках: ад акрэдытацыі і допінг-кантролю да функцый устойлівага развіцця і сэрвісаў для гледачоў на стадыёне.

*— Гісторыя ўзаемаадносін і сяброўства з расійскімі валанцёрамі доўжыцца з чэмпіянату свету па футболе FIFA,* — расказала **начальнік упраўлення па рабоце з валанцёрамі фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Надзея АНІСАВЕЦ.** *— Падпісанне дамовы — працяг гэтых адносін. У адпаведнасці з пагадненнем мы прымаем 25 расіян. Гэта найлепшыя валанцёры, і яны прыедуць дапамагаць нам на II Еўрапейскіх гульнях. У наступным годзе на чэмпіянаце Еўропы-2020 па футболе расіяне прымуць нашых найлепшых валанцёраў. Такія абмены будуць праходзіць і ў далейшым, пра што гаворыцца ў мемарандуме аб узаемаразуменні. Найлепшыя валанцёры будуць вызначаны ў розных намінацыях: самы пунктуальны, найлепшы валанцёр пэўнага функцыянальнага кірунку і г. д. Вынікі адбору будуць абвешчаны 3 ліпеня.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ІМКНУЦЦА ДА ПАВЫШЭННЯ

## Выданні да II Еўрапейскіх гульняў паказваюць высокую планку

**Такое меркаванне выказаў міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ на прэзентацыі тэматычных выданняў да спартыўнага форуму. Мерапрыемства адбылося ў абноўленым Доме кнігі «Светач».**

«Хацелася, каб спаборніцтвы такога велізарнага маштабу, як II Еўрапейскія гульні, паказалі яшчэ тую высокую планку, на якую трэба раўняцца ў тым ліку і ў кнігавыданні, і ў асветніцкім, культурным аспекце», — так Аляксандр Карлюкевіч патлумачыў, чаму гэтыя выданні прэзентуюцца напярэдадні адкрыцця спартыўнага форуму.

Што паказалі гасцям прэзентацыі? Календары, даведнік па Мінску і турыстычныя карты сталіцы. Усё гэта выпусціла выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Яшчэ была прэзентавана кніга «Спорт найвышэйшай пробы. Еўрапейскія і Алімпійскія гульні» з серыі «Беларусь спартыўная».

Дарэчы, на мерапрыемстве прысутнічалі замежныя журналісты, акрэдытаваныя на надыходзячыя спаборніцтвы. У гэты дзень супрацоўнікі замежных СМІ наведалі пяць аб'ектаў, у тым ліку стадыён «Дынама», стралковы цір імя Цімашэнкі і «Мінск-Арэну».

«Еўрапейскія гульні для нашай краіны — гэта магчымасць паказаць усё», — адзначыў міністр, тлумачачы, чаму замежных журналістаў прывезлі яшчэ і ў «Светач». Ён дадаў, што падчас спаборніцтваў у нас ёсць магчымасць расказаць замежным гасцям, як уладкавана наша краіна, які горад Мінск, паказаць нашы турыстычныя маршруты і, вядома, нашых людзей.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Да спартыўнай падзеі

# Білет на гульні, фан-зоны для гледачоў і надзея на перамогу

## Як Гродзенская вобласць сустракае II Еўрапейскія гульні

**Нягледзячы на тое, што грандыёзная спартыўная падзея пройдзе ў Мінску, рэгіянальны аргкамітэт жыве ў напружаным рытме. І не дзіва. Прыгранічны рэгіён сустракае значную колькасць гасцей, якія пачалі прыязджаць з-за мяжы. Балельшчыкі і ўдзельнікі II Еўрапейскіх гульняў могуць скарыстацца бязвізавым рэжымам, які дзейнічае з 10 чэрвеня да 10 ліпеня.**

### Настрой на гасцінны прыём

Плануецца, што праз памежныя пункты пропуску, што на тэрыторыі вобласці, на спартыўнае свята трапяць больш за 30 тысяч замежных гасцей. Таксама прыедзе шмат турыстычных груп, якія наведаюць як сталіцу, так і Гродзенскі рэгіён. Для пашырэння інфарматыўнасці на трасе М6, рэканструкцыя якой нядаўна завяршылася, устаноўлена 50 знакаў менавіта турыстычнага кірунку, што дазволіць замежнікам лепш арыентавацца ў рэгіёне. Будзе і яшчэ адзін важны інфармацыйны кантэнт.

— На гэтым тыдні мы запускаем новы мабільны дадатак «М6» пра магчымасці турыстычнага сэрвісу ў Гродзенскай вобласці, — паведаміў **начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Алег АНДРЭЙЧЫК.** — Гэта дазволіць лепш арыентавацца ў славутасцях рэгіёна, а магчыма, падштурхне турыстаў завітаць сюды па дарозе ў сталіцу. Дадатак будзе мець англамоўную версію, яго можна будзе лёгка спампаваць.

Для прыцягнення турыстаў робіцца многае. На трасе М6 наладжаны прыдарожны сэрвіс, насычаецца каляндар падзей на гэты час, усе гіды прайшлі неабходную сертыфікацыю. Гродзеншчына мае добры вопыт прыёму турыстаў, спрыяе гэтаму і бязвізавы рэжым. Дарэчы, дарэчы, тут сустракалі 50-тысячнага турыста — жанчыну з Польшчы, якой падарылі білет на адно са спаборніцтваў Гульняў. У рэгіёне працуюць на тое, каб стварыць максімальна зручныя ўмовы для замежных гасцей.

— Гродзенская вобласць, як і ўся краіна, рыхтавалася да гэтай падзеі, — падкрэсліў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.** — Тысячы гасцей — спартсменаў, удзельнікаў, балельшчыкаў — перш чым трапіць у сталіцу, будуць перасякаць межы рэгіёна. Важна, што яны тут убачаць, ці захочуць прыехаць сюды яшчэ раз. Таму задача — паказаць такі ўзровень гасціннасці і турыстычнай інфраструктуры, каб замежнікі захацелі вяртацца сюды зноў.

І зацікаўленасць ёсць. Ужо 20 турыстычных груп з-за мяжы вырашылі камбінавана падысці да паездкі ў Беларусь і разам з Гульнямі наведаць турыстычныя аб'екты Гродзеншчыны.

### Апынуцца ў атмасферы Гульняў

Подых спаборніцтваў адчуваюць і ў Гродне. **Намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Зоя КУЛЕША** расказала, што ў горадзе з'явяцца білборды з выявамі спартсменаў-удзельнікаў.

Эпіцэнтрам падзей стане ЦСК «Нёман», дзе арганізавана фан-зона на 300 пасадачных месцаў з вялікім экранам. Гасцей чакаюць беларуская кухня, фотазоны, пляцоўкі для дзяцей, інфармацыйная літаратура. Балельшчыкам дапамогуць 30 валанцёраў.

Фан-зона будзе працаваць з 16 да 21 гадзіны на працягу ўсіх спаборніцтваў, а трансляцыя важных спартыўных падзей будзе весціся з 10 гадзін. Дарэчы, падчас цырымоніі адкрыцця Гульняў у Мінску выступіць заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Ансамбль танца, музыкі і песні «Белыя росы», што ў Гродне.

Аддаецца ўвага бяспецы і ахове парадку. У абласным упраўленні ўнутраных спраў паведамілі, што асабісты склад перайшоў на ўзмоцнены рэжым нясення службы. Забяспечваць грамадскі парадак у Мінску будзе і зводны атрад з ліку супрацоўнікаў Гродзенскага ўпраўлення ўнутраных спраў. У Гродне пад асаблівую ўвагу трапяць фан-зона і культурныя мерапрыемствы.

### З марай пра першынства

У гэты час спартсмены актыўна рыхтуюцца да адказных выступленняў. У склад зборнай краіны ўвайшлі 30 атлетаў Гродзеншчыны, якія будуць адстойваць гонар краіны ў 13 відах спорту. Па прадстаўніцтве гродзенцы займаюць трэцяе месца пасля Мінска і Гомеля. Яшчэ восем чалавек — у рэзерве. Гэта ўдвая больш, чым было на I Еўрапейскіх гульнях у Баку, калі гродзенцы заваявалі для Беларусі восем медалёў. Найбольшае прадстаўніцтва — па спартыўных адзінаборствах, такіх як барацьба, дзюдо, самба.

Гродзенцы ёсць і ў зборнай па пляжным футболе, — дарэчы, гэты від спорту хоць і малады, але вельмі папулярны: на спаборніцтвы па ім раскуплены ўсе білеты, паведамілі ў абласным упраўленні спорту і турызму. Таксама ёсць удзельнікі з Гродна і ў такіх відах спорту, як стральба, веласпорт, бокс, скачкі на батуце і іншыя. Гродзенскія спартсмены ўпершыню прадстаўлены ў такім шырокім фармаце. На фінішнай прамой яны трэніруюцца вельмі напружана, кожны выкладваецца па максімуме і настроены на перамогу. І гэта сапраўды спартсмены высокага ўзроўню — фіналісты і прызёры Алімпійскіх гульняў, чэмпіёны і прызёры сусветных і еўрапейскіх спаборніцтваў.

Падтрымаць сваіх землякоў паедуць у сталіцу гродзенскія балельшчыкі. Адсюль накіруюцца каля 40 аўтобусаў. Для сваіх жыхароў раёны набылі 10 тысяч білетаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Атамнай зброі ў свеце стала менш, але ядзерныя дзяржавы працягваюць яе мадэрнізаваць

Агульная колькасць адзінак атамнай зброі ў свеце скарачаецца, але ядзерныя дзяржавы займаюцца яе мадэрнізацыяй, бо не гатовыя ў агляднай будучыні адмовіцца ад яе. Такія высновы ўтрымлівае чарговы даклад аб становішчы ядзерных узбраенняў, апублікаваны на сайце Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем міру (SIPRI). Як сказана ў дакуменце, на пачатак 2019 года ў свеце існуюць дзевяць ядзерных дзяржаў: Расія, ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Кітай, Індыя, Пакістан, Ізраіль і КНДР. Разам яны валодаюць прыкладна 13 865 адзінкамі ядзернай зброі (у пачатку мінулага года — каля 14 465). З іх 3750 разгорнуты ў аперацыйных часцях, амаль 2000 знаходзяцца ў стане высокай гатоўнасці. Па падліках SIPRI, агульнае змяншэнне ядзерных арсеналаў адбылося ў асноўным дзякуючы Расіі і ЗША, на якія сукупна прыпадае звыш 90 працэнтаў ядзерных узбраенняў. Як сцвярджаюць эксперты інстытута, па стане на студзень 2019 года ядзерны арсенал РФ налічваў каля 4330 боегаловак, а Злучаных Штатаў — 3800. Ядзерныя арсеналы ўсіх астатніх краін значна меншыя, аднак усе гэтыя дзяржавы альбо распрацоўваюць новыя сістэмы, альбо ўжо размяшчаюць іх, альбо абвяшчаюць пра намер ісці па гэтым шляху.

## Індыя ўвяла пошліны на тавары з ЗША

Індыя атрымае прыблізна 217 мільёнаў долараў дадатковага даходу ў выніку павышэння імпартных пошлін на 28 тавараў з ЗША, паведаміў ТАСС са спасылкай на тэлеканал NDT. Пошліны, якія днямі ўступілі ў сілу, сталі адказам на павышэнне амерыканскіх тарыфаў на ўвоз індыйскіх сталі і алюмінію. Раней улады краіны паведамілі, што імпартныя пошліны рэзка вырастуць на нут — да 60 % і сачавіцу — да 30 %. Акрамя таго, плануецца павышэнне пошлін на некаторыя віды міндаля, грэцкія арэхі, яблыкі і грушы, а таксама на борную кіслату, плоскі пракат з нержавеючай сталі, трубы і некаторыя іншыя металавырабы. Індыя планавала павысіць імпартныя тарыфы на шэраг амерыканскіх тавараў яшчэ ў жніўні мінулага года, але іх павышэнне некалькі разоў адкладалася. Улады тлумачылі гэта тым, што перагаворы з Вашынгтонам пра тарыфы працягваюцца.

## Французскія мільярдэры не пералічылі ні цэнта на аднаўленне Нотр-Дама

Буйныя бізнесмены, якія публічна паабяцалі даць сотні мільёнаў долараў на аднаўленне згарэлага ў красавіку Нотр-Дам дэ Пары, пакуль не пералічылі ні цэнта. Як піша АР, асноўныя ахвяраванні ў дабрачынныя фон-



ды, якія збіраюць грошы на аднаўленне сабора, ідуць ад радавых амерыканцаў і французаў. У гэтым месяцы дабрачынныя фонды зробяць першы перавод у 3,6 мільёна еўра. Гэтыя грошы патрэбныя, каб выплачваць зарплаты 150 рабочым, якія аднаўляюць царкву пасля пажару 15 красавіка. Амаль мільярд еўра паабяцалі перадаць на аднаўленне храма цэлы шэраг найбагацейшых сем'яў Францыі, а таксама буйных кампаній. Свае абяцанні яны рабілі ў спешцы, быццам спаборнічалі паміж сабой. У красавіку Франсуа Піно (яго кампаніі Kering належаць Gucci і Saint Laurent) паабяцаў €100 млн. Пра такую ж суму казаў Патрык Пуяне, генеральны дырэктар французскай энергетычнай кампаніі Total. Бернар Арно (яго холдынгу LVMH належаць Louis Vuitton і Dior) абяцаў €200 млн. Столькі ж мела намер пералічыць і сям'я найбагацейшай жанчыны свету і спадчынніцы L'Oreal Франсуазы Бетанкур-Маерс. Як заўважыў афіцыйны прадстаўнік сабора Андрэ Фіна, буйныя бізнесмены хочуць ведаць, на што будуць выдаткаваныя іх грошы, і не хочуць проста плаціць заробкі рабочым. Донары чакаюць, як будзе ісці рэканструкцыя, і будуць змагацца за кантракты.

Вакол кніг

# НАРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ

**Новым адрасам сучаснага кніжніцтва ў Беларусі становіцца фестываль у гарадскім пасёлку Мір. «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку», рупліва падтрыманыя Гродзенскім аблвыканкамам і Карэліцкім райвыканкамам, паказалі, што цікавасць да айчыннай кнігі на Гародзеншчыне надзвычайная. Пра гэта гавораць і госці, удзельнікі фестывалю. З некаторымі з іх пагутарыў наш карэспандэнт, задаўшы ўсяго адно пытанне: «Ці бачыце вы ў «Кніжных сустрэчах у Мірскім замку» традыцыю?»**

***Алесь БАДАК, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:***

— Гэтае першае кніжнае свята ў Мірскім замку — як вопыт асаблівай увагі да літаратуры гістарычнай, асветніцкай. На працягу дня мы размаўлялі з наведвальнікамі, пакупнікамі. Сустрэчы дапамаглі нам вылучыць і новыя тэматычныя акцэнты ў кнігавыданні.

***Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, паэт, радыёжурналіст:***

— Фестываль уразіў. Найперш тым, што ў адзін дзень столькі сабралася пісьменнікаў, дзеячаў культуры. Прэзентацыі Анатоля Бутэвіча, Віктара Хурсіка, Уладзіслава Місевіча (абавязкова прачытаю яго кнігу пра «Песняроў»!), Мікалая Ефімовіча (даведаўся, што вядомы тэлежурналіст яшчэ і аўтар кнігі пра Маю Плісецкую)...

***Нур аль-Даіем Абда аль-Гадзір Хамад аль-Ніел, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Судан у Рэспубліцы Беларусь:***

— Я толькі яшчэ знаёмлюся з Беларуссю. Найперш, зразумела, займаюся арганізацыяй эканамічных, палітычных стасункаў паміж нашымі краінамі. І пасля візіту ў Мірскі замак, куды я трапіў упершыню, уражаны ўвагай да кніжніцтва ў Беларусі. Спадзяюся, што мы станем рухацца да супольнай працы і ў гэтым кірунку. Чакаем беларускіх кнігавыдаўцоў на традыцыйным Хартумскім кніжным кірмашы.

***Кастусь КАЧАН, мастак:***

— Мне здаецца, што ў кніжнай справы і выяўленчага мастацтва ёсць нямала кропак судакранання. А што, як не гістарычная атмасфера, павінна спрыяць гэтаму?! Грамадства цягнецца да культуры. І творцам гэта трэба ўлічваць, адгукацца на гэты пасыл.

***Валерый КАЗАКОЎ, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі, намеснік старшыні ФНКА «Беларусы Расіі»:***

— «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку» павінны стаць добрай традыцыяй. Месцам, куды проста прыходзяць на сустрэчу з сябрамі, прыходзяць па новыя кніжныя набыткі. Дакладней — на сустрэчу з новымі кнігамі! Дзякуй арганізатарам, што змаглі супольна правесці такое сапраўды кніжнае свята!

...«Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку» — новы і цікавы праект, які прыцягнуў увагу да беларускай друкаванай кнігі. Добра было б мець такія асветніцкія, кніжныя праекты ў розных гарадах, розных рэгіёнах краіны. Хіба ж не шануюць друкаваную кнігу, хіба ж не цікавяцца ёю ў Віцебску і Магілёве, Гомелі і Брэсце, іншых гарадах, іншых куточках Беларусі?!

**Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.**

Падзея

## Андрэй РАЎКОЎ:

# ЛЮБАЯ МАЦІ ЗАЎЖДЫ ХВАЛЮЕЦЦА ЗА СВАЙГО СЫНА



**Пра гэта заявіў міністр абароны Беларусі падчас цырымоніі прынясення воінскай прысягі ў 72-м Аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў у Печах.**



Словы на вернасць Радзіме там прамовілі больш за тысячу юнакоў.

— Дзень прысягі заўжды ўрачысты як для салдат, так і для родных і блізкіх, якія прыехалі сюды сёння, — адзначыў Андрэй Раўкоў. — Любая маці заўжды хвалюецца за свайго сына. Важна гэта і ў маштабе краіны, паколькі Узброеныя Сілы выконваюць у мірны час непрыкметную на першы погляд задачу. Але мы забяспечваем мірную працу беларускага народа.

Літаральна праз некалькі месяцаў, пасля заканчэння падрыхтоўкі па ваенна-ўліковых спецыяльнасцях, гэтыя спецыялісты прыйдуць у часці і будуць выконваць свае задачы, тым самым умацоўваць абараназдольнасць Беларусі.

Міністр абароны асобна спыніўся на скарачэнні колькасці адтэрміновак ад службы:

— Мяркуецца шраг заходаў у гэтым кірунку. Існуе законапраект, які зараз знаходзіцца на ўзгадненні ў дзяржаўных органах. Змянілася абстаноўка, і адтэрміновак па адукацыі павінна быць меней. Але разам з тым замацоўваюцца і пэўныя матывацыйныя рэчы. Студэнты, якія маюць пасля службы рэкамендацыі з часцей, атрымаюць першачарговае права на месца ў інтэрнаце. Для тых, хто працаваў да прызыву, мяркуецца захаваць іх месца незалежна ад формы ўласнасці арганізацыі. Прапануецца таксама зацвердзіць перавагу для тых, хто прайшоў праз тэрміновую ваенную службу пры паступленні ва ўстановы адукацыі і бясплатным навучанні на падрыхтоўчых курсах.

Таксама ў законе прадугледжваецца павышэнне адказнасці за ўхіленне ад службы.

У найбліжэйшы час праект закона паступіць у парламент на разгляд.

Аляксандр Мамайка прызваўся з Мінска. Яму належыць служыць паўтара года. Перад войскам хлопец скончыў Беларускі дзяржаўны медыцынскі каледж.

— Я паспеў папрацаваць цэлы год, быў нават загадчыкам аптэкі. Пасля таго як трапіў сюды, адразу было вельмі нязвыкла — усё па рэжыме, усё згодна з загадам. З іншага боку, вучышся цярпенню і разважлівасці. Я ў будучым — механік-кіроўца БМП-2. Да таго круціў баранку легкавога аўтамабіля на «грамадзянцы» тры гады. Пакуль што ў нас ідуць агульнавайсковыя занятні, а ў ліпені пяройдзем да тэм па спецыяльнасці. У «вучэбцы» я правяду паўгода, а далей, хутчэй за ўсё, мяне накіруюць у 120-ю асобную механізаваную брыгаду ў Мінск. Што да вынослівасці, то параю рыхтавацца тым, каго прызавуць праз паўгода, ужо зараз. Калі вы не ўмееце падцягвацца, то будзе складана.



Антон Буйко таксама праўдзе ў армейскіх шэрагах паўтара года. За яго плячыма — Мінскі радыётэхнічны каледж і невялікі досвед працы.

— Да прызыву паставіўся спакойна. Калі трэба — значыць трэба. Пэўная падрыхтоўка ў мяне ўжо ёсць. Падчас вучобы хадзіў з сябрамі ў паходы. Заўжды прыцягвала спартыўнае арыентаванне. На дапрызыўнай падрыхтоўцы вучылі зборцы-разборцы зброі, страявому кроку. Тут жа камандзірскі склад вельмі добры. Нават калі ты прыйшоў у войска ў 18 гадоў і нічога не ведаеш — цябе ўсяму навучаць. Кантакты з роднымі і блізкімі мы не перарываем — падчас вольнага часу, які доўжыцца з 8 да 9 вечара, мы можам тэлефанаваць адзін аднаму.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Падрабязнасці

# Навучыць бяспецы дашкалят

**Фестываль «Бяспечнае дзяцінства» праходзіў ужо трэці раз. Сёлета яго пераможцаў віншавалі ва Універсітэце грамадзянскай абароны. Педагогі з шасці абласцей і Мінска паказвалі свае напрацоўкі датычна таго, як жа навучыць выхаванцаў дзіцячых садкоў правільным дзеянням падчас надзвычайнай сітуацыі.**

Па ўмовах фестывалю, установы дашкольнай адукацыі прадставілі свае работы ў чатырох намінацыях. Сярод іх — «Куток бяспекі», «Ганарымся, што навучылі», «Дыдактычная гульня» і «Азбука бяспекі». Такім чынам, бяспека дзяцей паўстала праз прызму творчасці. Арганізатарамі фестывалю сталі міністэрствы па надзвычайных сітуацыях і адукацыі.

— Для Міністэрства па надзвычайных сітуацыях фарміраванне з самых юных гадоў культуры бяспекі было і застаецца прыярытэтам, — зазначыў **міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.** — І фестываль «Бяспечнае дзяцінства» — яшчэ адзін крок да супрацоўніцтва ўсіх для дасягнення гэтай мэты. Свет вакол нас не ідэальны. Навокал — мноства небяспек, пагроз, разнастайных выклікаў. І самая ўразлівая катэгорыя — гэта дзеці. Асабліва калі яны знаходзяцца без нагляду з боку дарослых. Мы вельмі ўдзячны Міністэрству адукацыі, выхавальнікам устаноў дашкольнай адукацыі. У найбліжэйшы час, напэўна, зможам нават у нейкай ступені змяншыць нашу прафілактычную работу, таму што яна актыўна праводзіцца на месцах.

— Дзяцінства — гэта творчыя пошукі, якія ствараюць маляўнічыя ўражанні. Разам з тым ад нас, дарослых, залежыць тое, наколькі бяспечнай будзе абстаноўка вакол нашых дзяцей, — падкрэсліла **першы намеснік міністра адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА.** І тут важна не толькі супрацоўніцтва ў гэтым кірунку міністэрстваў, ведамстваў, але і ўзаемадзеянне педагогаў, сем'яў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Крымінал, здарэнні

## Спірт не вытрымаў гарачыні

**У вёсцы Бродніца Іванаўскага раёна на лікёра-гарэлачным заводзе ўспыхнула пара спірту без наступнага гарэння. На шчасце, ніхто не пацярпеў.**

Выклік ратавальнікам паступіў у 16.36. Калі на месца прыбылі супрацоўнікі МНС, высветлілася, што ўспышка адбылася ў пустой металічнай ёмістасці аб'ёмам 1,5 кубаметра на чацвёртым паверсе будынка. У той час там праводзіліся зварачныя работы па замене цеплаабменніка, унутры памяшкання былі тры работнікі. Прычыны здарэння ўстанаўліваюцца. Версія, якая разглядаецца найперш, — разбурэнне ёмістасці ў выніку нагрэву ад прамых сонечных праменяў (яна стаяла за паўтара метра ад акна).

## Арсенал на дваіх

**Супрацоўнікі 6-га ўпраўлення (па Брэсцкай вобласці) галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй (ГУБАЗіК) МУС канфіскавалі ў двух жыхароў Брэсцкага раёна вялікі арсенал агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў.**

Па інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, дома, у гаражах і іншых памяшканнях, якія ім належаць, мужчыны захоўвалі пісталет ТТ, запал да гранаты, некалькі самаробных пісталетаў, вінтоўку неўстаноўленага ўзору, самаробнае выбуховае прыстасаванне, 872 патроны рознага калібру, абсталяванне для вырабу патронаў, мінамётную міну калібру 50 мм з узрывальнікам, пяць артылерыйскіх снарадаў калібру 20 мм, гранату Ф-1 і іншыя боепрыпасы. Абодва затрыманыя выраблялі самаробныя ўзоры сучаснай стралковай зброі, а таксама займаліся рэстаўрацыяй зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны. За незаконнае дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў прадугледжана пакаранне аж да пазбаўлення волі на тэрмін да сямі гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «МГЦН» 19 июля 2019 г. проводит 259-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)**

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Арендодатель – **УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский**, тел.: +375 (17) 225 61 21, +375 (17) 225 69 77 | | | | | | | |
| *1* | г. Минск, пл. Привокзальная, 5А | 5,2 | 10,4 БАВ | 21,97 | Под организацию розничной торговли продовольственной группой товаров и (или) непродовольственной группой товаров (книгами, канцтоварами, печатными изданиями, СМИ, полиграфической продукцией, сувенирной продукцией, товарами для животных и другими товарами), кроме товаров, бывших в употреблении, товаров ритуального назначения, товаров интимного характера и лекарственных средств | 2,10 | Площадь расположена в подземном переходе от станции метро «Площадь Независимости» к главному корпусу Северного железнодорожного вокзала. Отсутствуют: центральное отопление в период отопительного сезона, естественное освещение, водопровод, канализация, телефонная связь. Вход общий. Необходимость ремонта отсутствует. В ТЦ «Галиллео» имеется платная парковка. **Срок аренды – 3 года.** (1*) |
| *1* Необходимые условия: победителю аукциона необходимо заключить договор аренды на роллетную конструкцию с ОАО «ДОРОРС». Электроснабжение данного павильона осуществляется через единую сеть торгового комплекса, принадлежащую ОАО «ДОРОРС» на основании отдельно заключаемого договора посредством однофазного ввода. Установленная допустимая мощность – 1 кВт (потребитель III кат. надежности электроснабжения). В случае необходимости увеличения мощности электропотребления по объекту необходима разработка проекта на электроснабжение установленным порядком. Телефоны отдела по распоряжению имущества ОАО «ДОРОРС»: +375 (17) 240 62 19; +375 (17) 240 62 06* | | | | | | | |
| 2 | г. Минск, пл. Привокзальная, 3 | 1,0 | 6 БАВ | 4,23 | Под размещение многофункционального банкомата | 0,40 | Площадь (согласно схеме) расположена в служебно-техническом здании на 1-м этаже в вестибюле гостиницы «Экспресс». **Срок аренды – 3 года.** (2*) |
| 3 | г. Минск, пл. Привокзальная, 3 | 1,0 | 6 БАВ | 4,23 | Под размещение вендингового аппарата по продаже кофе | 0,40 | Площадь (согласно схеме) расположена в служебно-техническом здании на 1-м этаже в вестибюле гостиницы «Экспресс». **Срок аренды – 3 года.** (2*) |
| *2* Выполнен ремонт в соответствии с существующими требованиями современного дизайна и стиля. Номерной фонд гостиницы составляет 53 комфортных номера с категорией от третьего разряда до высшего с размещением до 96 гостей одновременно. Имеются центральное отопление, естественное освещение, в ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. Рядом расположены остановки городского транспорта, пригородного сообщения, автовокзал, метрополитен (станция «Площадь Ленина»)* | | | | | | | |
| Арендодатель – **БелНИИТ «Транстехника»,** тел. +375 (17) 331 79 69 | | | | | | | |
| 4 | г. Минск, ул. Платонова, 22 | 58,75 в т. ч.:<br>41,75 (гараж)<br>17,00 (бытовка) | 3,0 | 248,22 | Под хранение и техническое обслуживание транспортных средств<br>Под административные цели (офис) | 24,80 | В гараже пол устлан гравием, проведена электропроводка, стены облегченной кирпичной кладки высотой 2,6 м, двое железных ворот с замками, задвижками. Бытовка – одноэтажное бескаркасное здание, стены кирпичной кладки высотой 3 м, пол устлан досками, дверь металлическая |
| Арендодатель – **УП «Жилье»,** тел. 8 (0177) 76 85 32 | | | | | | | |
| 5 | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, б-р Комарова, 20 | 14,40 | 1,0 | 60,84 | Под офис, склад, организацию торговли непродовольственной группой товаров (кроме магазинов ритуальных услуг), предоставление услуг (кроме похоронных бюро) | 6,00 | Помещение расположено в подвале жилого дома. Аренда с условием: арендатору необходимо за свой счет без возмещения затрат произвести ремонт витрин. **Срок аренды – 3 года.** (3*) |
| *3* Стены – панельные; вентиляция – естественная, отопление – центральное. Имеется санузел. Электроснабжение отсутствует, имеется возможность подключения. Помещение обременений не имеет. Победитель аукциона обязан заключить договоры на вывоз твердо-бытовых отходов, снабжение электрической энергией, пользование тепловой энергией в горячей воде, отпуск воды и прием сточных вод* | | | | | | | |
| Арендодатель – **Государственное учреждение «Республиканская клиническая больница медицинской реабилитации»**, тел. +375 (17) 509 71 04 | | | | | | | |
| 6 | Минская область, Минский район, Горанский сельсовет, дер. Аксаковщина, ул. Лесная, 15 | 74,6 | 3,0 | 315,19 | Под торговый объект | 31,50 | Встроенное помещение одноэтажного здания. Вход отдельный. Имеются: отопление, естественное освещение, энергоснабжение. Не используется с марта 2018 года. **Срок аренды – 3 года.** (4*) |
| *4* Требуется проведение ремонта. Возможно подключение холодного водоснабжения. Горячее водоснабжение возможно подключить от колодца (приблизительно 5 м от здания)* | | | | | | | |
| Арендодатель – **УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений**, тел.: +375 (163) 49 51 46 | | | | | | | |
| *7* | Брестская обл., г. Барановичи, ул. Притыцкого, 1А/1 | 124,9 | 56,56 БАВ | 527,70 | Под склад, хранение товарной продукции, выгрузку груза | 52,70 | Помещение (88,1 кв.м) в здании склада № 2 грузового двора и часть рампы (36,8 кв. м). **Срок аренды – 3 года.** (5*) |
| *8* | | 122,8 | 55,25 БАВ | 518,83 | | 51,80 | Помещение (86,0 кв. м) в здании склада № 2 грузового двора и часть рампы (36,8 кв.м). **Срок аренды – 3 года.** (5*) |
| *9* | | 931,6 | 194,75 БАВ | 3 936,01 | | 393,60 | Помещение (269,2 кв. м) в здании склада № 2 грузового двора, часть рампы (259,4 кв. м) и навес (403,0 кв. м). **Срок аренды – 3 года.** (5*) |
| *5* Фундамент – бетон, наружные стены – кирпич, перекрытия – деревянные, крыша – асбестоцементный волнистый лист, полы – бетон, окна – деревянные, двери, ворота – металлические изделия, деревянные щиты, вентиляция – с естественным побуждением. Имеется электроснабжение. Необходимые условия: заключение договора на электроснабжение, вывоз ТКО. В договоре аренды будет предусмотрено одним из условий расторжения договора по требованию арендодателя – производственная необходимость* | | | | | | | |
| 10 | Гродненская обл., Дятловский р-н, Новоельнянский поселковый Совет с/с, г. п. Новоельня, ул. Шоссейная, 8 | 646,66 | 32,51 БАВ | 2 732,14 | Под склад | 273,20 | Отдельностоящее одноэтажное здание склада газовых баллонов (583,5 кв. м) и два навеса (63,16 кв. м). **Срок аренды – 3 года.** (6*) |
| *6* Фундамент – бутобетонный, наружные стены – металлический каркас обшит жестью, крыша – жесть, полы – бетонные, оконные проемы – нет, дверные проемы – металлические, вентиляция – естественная. Необходимые условия: заключение договора на вывоз ТКО. В договоре аренды будет предусмотрено одним из условий расторжения договора по требованию арендодателя – производственная необходимость* | | | | | | | |
| 11 | Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ст. Столбцы, 1 | 152,3 | 36,55 БАВ | 643,47 | Под размещение магазина розничной торговли, организацию общественного питания | 64,30 | Помещение в одноэтажном здании вокзала. Имеются: центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, водоотведение. **Срок аренды – 3 года** (7*) |
| *12* | | 44,9 | 10,78 БАВ | 189,70 | Под размещение парикмахерской, оказание услуг | 18,90 | Помещение в одноэтажном здании вокзала. Имеются: центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, водоотведение. **Срок аренды – 3 года** (7*) |
| *13* | | 20,7 | 4,97 БАВ | 87,46 | Под размещение магазина розничной торговли, организацию общественного питания, оказание услуг | 8,70 | Помещение в одноэтажном здании вокзала. Имеются: центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, водоотведение. **Срок аренды – 3 года** (7*) |
| *7* Необходимые условия: заключение договоров на водоснабжение, водоотведение, вывоз ТКО. В договоре аренды будет предусмотрено одним из условий расторжения договора по требованию арендодателя – производственная необходимость. Помимо договора аренды с арендатором будут заключены договоры о взаимоотношениях в части электроснабжения и теплоснабжения* | | | | | | | |
| 14 | Гродненская обл., Дятловский р-н, Новоельнянский поселковый совет с/с, г. п. Новоельня, пер. Железнодорожный, 1 | 11,1 | 1,2 БАВ | 46,90 | Под организацию розничной торговли, оказание услуг, размещение офиса | 4,60 | Помещение на 1-м этаже двухэтажного здания железнодорожного вокзала. Имеются: центральное отопление, электроснабжение. В здании имеются: водоснабжение, водоотведение. **Срок аренды – 3 года** (8*) |
| 8* Необходимые условия: получение технических условий, разработка проектной документации с установкой прибора учета электрической энергии в соответствии с Правилами электроснабжения, оформление документации на электроснабжение в установленном порядке с оформлением акта осмотра инспекцией Энергонадзор и предоставление его арендодателю. Помимо договора аренды с арендатором будут заключены договоры о взаимоотношениях в части электроснабжения и теплоснабжения. Все работы за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат. В договоре аренды будет предусмотрено одним из условий расторжения договора по требованию арендодателя – производственная необходимость | | | | | | | |
| Арендодатель – **ОАО «Полиграфкомбинат им. Я. Коласа»**, тел.: +375 (17) 398 20 31, +375 (029) 399 83 86, +375 (17) 365 66 41, +375 (17) 398 06 53, +375 (29) 564 63 44 | | | | | | | |
| *15* | г. Минск, ул. Асаналиева, 50 (общежитие) | 38,0 | 3,0 | 160,55 | Под офис, торговый объект, оказание услуг (допустимых в жилых помещениях) | 16,00 | Встроенное помещение на 1-м этаже. Вход отдельный с улицы (9*) |
| 9* Имеются: санузел, центральное отопление. Необходимые условия: проведение ремонта, разработка арендатором проекта на электроснабжение для последующего оформления в качестве субабонента арендодателя в филиале «Энергосбыт»; регистрация в ЦРП «Водосбыт» как потребителя хозпитьевой воды | | | | | | | |

БАВ – базовая арендная величина с 01.04.2019 составляет 16,90 рубля.

**Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.**

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **19 июля 2019 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**.

**Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

– уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 259 от 19.07.2019 по предмету аукциона №_____**), перечисляемый на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.** *При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении;*

– подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

– заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 19 июня 2019 г. по 15 июля 2019 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

**Порядок определения победителя аукциона:**

– торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

– аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договоры аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок: отдел аукционов** – + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** – + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** – + 375 (17) 328 36 58**. Интернет: www.mgcn.by**

# ТРАГЕДЫЯ АДНОЙ СЯМ'І І... МНОГІХ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Большасць пратаколаў за хатні гвалт у нашым раёне складзены якраз на людзей, якія б'юць сваіх бацькоў, — кажа **участковы інспектар Савецкага РУУС г. Мінска Андрэй ВЫРВІЧ.** — У кожнай такой сям'і сваё гора. Па маіх асабістых назіраннях, не заўсёды бацькі вінаватыя ў паводзінах дзяцей. Многае залежыць і ад самога чалавека. За час сваёй працы бачыў людзей, чые бацькі здаваліся добрымі і працавітымі людзьмі, а іх дзеці сталі алкаголікамі. Таму дакладна цяжка сказаць, што на самай справе адбываецца ўнутры ў чалавека і што яго можа зламаць.

Участковы ходзіць па кватэрах і запрашае дэбашыраў у аддзяленне на размову. Такім чынам супрацоўнікі міліцыі стараюцца выявіць праблемы канкрэтнай сям'і, а потым вырашаюць, у якім кірунку рухацца, каб дапамагчы ёй. Днём наведвае падапечных, якія не працуюць. Пазней — тых, хто працуе. Мы якраз накіроўваемся да беспрацоўнага Сяргея. Дарогай участковы расказвае пра спецыфіку работы па прафілактыцы хатняга гвалту.

Часцей за ўсё міліцыю выклікаюць да людзей у стане алкагольнага ап'янення, якія ўчыняюць дома скандал і пачынаюць біцца. У такія моманты сваякі дэбашыра разгубленыя, напалоханыя і не ведаюць, што рабіць, таму і звяртаюцца па дапамогу. Падчас скандалу прыязджае нарад міліцыі, высвятляе ўсе абставіны: супрацоўнікі ўдакладняюць, якім чынам адбываўся скандал, складаюць пратакол, і ўжо на яго падставе скандаліст прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасці. Калі сітуацыя паўтараецца, то яму прад'яўляецца афіцыйнае папярэджанне аб тым, што калі ён на працягу года яшчэ раз будзе прыцягнуты за падобнае да адказнасці, то яго паставяць на прафілактычны ўлік як асобу, схільную да сямейнага гвалту.

— Такіх людзей наведваем не менш чым раз на месяц, — расказвае ўчастковы. — Высвятляем, чым



яны займаюцца, дзе працуюць, нават з кім сябруюць і за чый кошт жывуць. Потым проста размаўляем і выклікаем на прафілактычныя мерапрыемствы. А гэта могуць быць лекцыі аб гвалце, можа быць і кіналекторый, на якім мы дэманструем пэўныя відэасюжэты. Беспрацоўным дапамагаем уладкавацца на работу.

Калі на чалавека прафілактыка не мае ўздзеяння і ён па-ранейшаму паводзіць сябе агрэсіўна, прымяняюцца больш актыўныя і жорсткія меры. Напрыклад, такому могуць выпісаць ахоўнае прадпісанне і выселіць з дому на тэрмін да трыццаці сутак.

Бывае, што такая мера дапамагае. Так, нядаўна пажылы падапечны ўчасткова сам вырашыў легчы на лячэнне ад алкагалізму. Пасля чарговага скандалу з сынам і яго жонкай ён атрымаў ахоўнае прадпісанне. Вырашыў для сябе, што гэта апошняя кропля. Лёг у бальніцу лячыцца ад алкагалізму, спадзеючыся, што здолее яшчэ наладзіць адносіны з сям'ёй.

Яшчэ адна мера, да якой могуць звярнуцца блізкія хворага на алкагалізм агрэсара, — абмежаванне ці пазбаўленне дзеяздольнасці. Гэта робіцца ў выпадку, калі ў такога чалавека ёсць сям'я і работа, але ён увесь свой заробак прапівае і жыве за кошт блізкіх. У выніку атрымліваць заробак ці пенсію будуць сваякі.

— Калі дэбашыр цвярозы, то звычайна не чыніць ніякіх скандалаў, — тлумачыць Андрэй Вырвіч. — З ім можна размаўляць і неяк дамаўляцца. Але як толькі вып'е, то ўсё — цягне на «подзвігі». У маёй практыцы не сустракаліся выпадкі, калі міліцыю выклікалі на цвярозага чалавека.

...Нарэшце, мы на месцы. Адчыняе дзверы пажылая жанчына. Гэта Алена Іванаўна — маці Сяргея, з якім праводзіць работу ўчастковы. Міліцыянер прыйшоў запрасіць мужчыну ў аддзяленне — здаецца, ім удалося знайсці для яго работу.

— Я толькі вярнуўся з ЛПП! — абураецца Сяргей, убачыўшы на парозе міліцыянера.

Мы ўсе прадстаўляемся. Жанчына з горычу звяртаецца да нас:

— Яму проста трэба ісці працаваць, каб працаваў — усё было б нармальна.

— Што ты нясеш, — не вытрымлівае Сяргей. — Мяне ўжо нідзе не бяруць!

Калі ўчастковы расказвае навіну пра вакансію для яго, мужчына хмурыцца.

— У мяне спіна баліць, якая работа?

— Ты ўжо тры гады не працуеш! — нервуецца Алена Іванаўна.





— Гэта не злачынства!

— Як не злачынства? Не злачынства, што ты за маю пенсію жывеш? Ён нап'ецца і тады пачынае крычаць, — паварнуўшыся да нас расказвае жанчына. — Я пагражаю міліцыю выклікаць, а ён тады мяне штурхае і за рукі хапае... Стараюся пра гэта нікому не казаць, але мне надакучыла яго п'янства, яго непавага да мяне! Муж калі памёр, я засталася адна. Добры быў чалавек. Але нават тады, калі бацька ягоны жыў, мы не маглі прымусіць яго працаваць.

— Ты ўсё хлусіш! — крычыць Сяргей. — Мяне тры разы забіралі ў ЛПП, і ўсе разы з работы!

— Ой, не магу я ўжо, — голас жанчыны пачынае дрыжаць. — Усе рукі ў сіняках ад яго!

— Ты сама вінаватая! Хто мне на бутэльку дае, га?

— Я табе на бутэльку? Ты ж за горла дзеля бутэлькі схопіш! Апошняе адбярэш. Хіба так можна жыць? Хоць бы яго куды забралі! Я магу ўсё сама. Ды і суседзі добрыя, дапамогуць калі што, лепш за цябе.

— А чым я табе дапамагу? У хаце прыбраць, ці што? — Мужчына мякчэе. Яму становіцца шкада маці. — Ведаеце, а ў мяне адукацыя вышэйшая. Але не знайшоў сябе ў кірунку, што выбраў. Няўдала ажаніўся. Жонка гуляла... Я ж на самай справе працаваў. Апошнім часам, праўда, толькі грузчыкам і ў ЖЭСе. Ну добра, заўтра схаджу ў міліцыю, пагляджу, што там прапануюць.

— У яго ж і кватэра была, але ён яе прапіў, — са слязамі на вачах перабівае яго маці.

— Усё, хопіць, пойдзем лепш сфатаграфуемся! — нечакана прапаноўвае мужчына.

Маці з сынам накіраваліся ў гасцёўню. Там яны стараліся ўсміхацца, абмяркоўвалі, як лепей сесці, каб добра выглядаць на фота. На імгненне здалося, што і не было той непрыемнай паўгадзіны «разборак»...

— Вельмі важна пакідаць кватэру тады, калі людзі перасталі сварыцца, — упэўнены міліцыянер. — Гэта, канешне, не гарантуе, што яны зберагуць мірны настрой, але ўсё ж ёсць надзея. Бывае, што пасля ЛПП, з якога вярнуўся Сяргей, людзі мяняюцца. У гэтай установе жывуць і працуюць па графіку. Там ёсць час падумаць. Аднойчы мне нават падзякаваў малады чалавек. Ён некалькі разоў прыцягваўся за правапарушэнні ў алкагольным стане і ў выніку аказаўся ў ЛПП. Прыехаў адтуль і адразу да мяне: маўляў, дзякуй за шанц. Прыемна было. Такія выпадкі дапамагаюць не страціць веру ў людзей.

Здаецца, што і Алена Іванаўна ўсё яшчэ верыць у свайго сына...

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ.**

Надвор'е

## КРЫХУ ДАЖДЖОЎ, І ЗНОЎ СПЯКОТА

### Да канца тыдня на паўднёвым усходзе да плюс 33 градусаў

**Вось так вось. Трэці тыдзень запар на тэрыторыі нашай краіны трымаецца анамальна цёплае надвор'е. У першай палове тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будзе ў асноўным вызначаць вобласць павышанага ціску, таму будзе пераважна без ападкаў, у другой палове тыдня пад уплывам атмасферных франтоў чакаецца няўстойлівае з кароткачасовымі дажджамі надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўночным усходзе краіны месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 23 да плюс 29 градусаў. У сераду будзе таксама пераважна без ападкаў, толькі ў дзённыя гадзіны ў асобных раёнах па крайнім захадзе Брэсцкай вобласці магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 9 да плюс 16 градусаў, удзень — 24—31 цяпла.

Атмасферны фронт прынясе істотныя ападкі ўжо ў чацвер. У гэтыя суткі ўначы ў заходніх раёнах, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах краіны будуць ісці кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—18 цяпла, на паўднёвым захадзе — 19—20 градусаў вышэй за нуль. Удзень чакаецца 24—30 градусаў, на паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да 32 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу пад уплывам малярухомага франтальнага раздзелу ноччу месцамі, а ўдзень у многіх раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 15—20 цяпла, удзень у асноўным будзе ад плюс 24 да плюс 30 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны паветра прагрэецца да 33 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Спёка, алкаголь, вада...

### У спалучэнні гэтыя фактары прывялі да мноства ўтапленняў

**За мінулыя пятніцу і выхадныя, калі ў краіне ўстанавілася асабліва гарачае надвор'е, на вадзе загінула 16 чалавек.**

Па інфармацыі Таварыства ратавання на водах, у Магілёўскай вобласці адбылося мінімум шэсць такіх выпадкаў. 40-гадовы мужчына патануў у возеры каля вёскі Цімохаўка Горацкага раёна, 45-гадовая жанчына — на возеры аграгарадка Трылесіна Дрыбінскага раёна, 62-гадовы пенсіянер — у Дняпры ў Магілёўскім раёне. Усе яны купаліся, некаторыя нападпітку. 67-гадовы пенсіянер загінуў на возеры ў Бабруйску, калі п'яны зваліўся ў ваду.

На Брэстчыне з 14 да 16 чэрвеня ў вадаёмах загінула восем чалавек. Паводле папярэдняй інфармацыі, усе яны былі нападпітку.

У Пінскім раёне было два выпадкі ўтаплення. 14 чэрвеня жанчына з вёскі Кубнова знайшла цела свайго суседа ў Прыпяці. 59-гадовы мужчына, які жыў на беразе ракі, патануў. Яшчэ адзін інцыдэнт адбыўся 16 чэрвеня на рацэ Стыр у гэтым жа раёне. 35-гадовы жыхар Пінска паехаў адпачываць да вадаёма са сваёй дзяўчынай. Выпіўшы спіртнога, мужчына адправіўся купацца. Гэты заплыў стаў для яго смяротным — цела знайшлі ў вадзе.

Яшчэ адзін пікнік скончыўся смерцю ў Драгічыне. Кампанія маладых людзей адправілася на вадасховішча. Там яны весяліліся, купаліся і пілі алкаголь. Праз некаторы час усе разышліся, але адзін з кампаніі застаўся каля вадаёма. 16 чэрвеня цела 31-гадовага мужчыны знайшлі ў вадзе.

Такі ж выпадак адбыўся ў Пружанскім раёне. Кампанія вырашыла адпачыць у забароненым для купання месцы. 36-гадовы мужчына зайшоў у ваду і не вярнуўся. Праз некаторы час яго цела знайшлі ў возеры.

У Ляхавіцкім раёне ў возеры патануў 49-гадовы мужчына, у Камянцы — 52-гадовы, у Брэсце — 32-гадовая жанчына. Пры падобных абставінах загінуў малады хлопец у Бярозаўскім раёне.

У Гомельскай вобласці 14 чэрвеня 29-гадовы мужчына патануў, калі скокнуў у ваду з самаробнага трампліна. Здарэнне адбылося на Сожы ў Чачэрскім раёне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13

**Предмет аукциона**

**Недвижимое имущество, расположенное по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г. п. Руба, ул. Центральная, д. 33**

| лот № | Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Производственно-бытовой корпус, компрессорный цех** (здание многофункциональное) | 646,6 кв. м | 200/С-81409 |

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,0697 га для обслуживания производственного здания

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственные лица: Каминский Павел Иванович, тел. +375 29 659-14-39, Вершибалюк Михаил Михайлович, тел. +375 29 668-16-26

**Начальная цена с НДС 20 %: 98 280,00 бел. руб. (BYN)**

**Шаг аукциона: 4 914,00 бел. руб. (BYN)**

Капитальное строение, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Скидельское, 2В

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2 | **Здание гаража-мастерской (здание многофункциональное)** | 388,9 кв. м | 400/С-92718 |

**Сведения о земельном участке:** предоставлен продавцу на праве аренды по 11.10.2060 г. общ. пл. 0,0958 га для обслуживания здания гаража-мастерской

**Начальная цена с НДС 20 %: 25 998,00 бел. руб. (BYN)**

**Шаг аукциона: 1 299,90 бел. руб. (BYN)**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственные лица: Каминский Павел Иванович, тел. +375 29 659-14-39, Марчик Петр Иванович, тел. 8 029 821-07-71

**Недвижимое имущество, реализуемое одним лотом**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3 | **Административно-бытовой корпус** (здание административно-хозяйственное). Адрес: Гродненская обл., Сморгонский р-н, Залесский с/с, 13, административно-бытовой корпус северо-западнее д. Михневичи | 376,5 кв. м | 443/С-17850 |
| | **Производственно-бытовой корпус** (здание нежилое). Адрес: Гродненская обл., Сморгонский р-н, Залесский с/с, п/о Михневичи | 567 кв. м | 443/С-14201 |

В состав лота входит следующее оборудование: шкаф ВРУ, инвентарный номер 21675, кран-балка, инвентарный номер 50094

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,2872 га для размещения объектов неустановленного назначения (эксплуатации и обслуживания зданий). Ограничения (обременения) прав в использовании земель по строительству, благоустройству и тому подобные (охранная зона теплотрассы), площадь 0,1350 га

**Начальная цена с учетом НДС 20 % – 177 139,20 бел. руб.**

**Шаг аукциона – 8 856,96 бел. руб.**

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни с 8.00 до 17.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственные лица: Каминский Павел Иванович, тел. +375 29 659-14-39, Шутович Татьяна Михайловна, тел. 8 029 867-23-33

**Оборудование, транспорт, спецтехника, расположенная по адресу: г. Брестская обл., г. Горынь**

| Лот п/п | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска / дата принятия к бух. учету | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
| 4 | 5026 | Грузовой бортовой UAZ 3303, рег. номер 0297 МИН | 408,00 | 20,40 |
| 5 | 21739 | Выпрямитель сварочный ВД-306УЗ | 74,40 | 3,72 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Остапчук Юрий Михайлович, тел. 8 029-527-94-86

**Оборудование, транспорт, спецтехника, расположенная по адресу: г. Брест, ул. Гоздецкого, 26**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6 | 21764 | Вышка «Атлант» | 112,80 | 5,64 |
| 7 | 3257 | Сварочный выпрямитель ВДМ-1001 | 160,80 | 8,04 |
| 8 | 3271 | Станок ЗК-634 | 165,60 | 8,28 |
| 9 | 3258 | Станок МН-18 | 456,00 | 22,80 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Драка Евгений Николаевич, тел. 8 029 574-00-68

**Оборудование, транспорт, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Машинистов, 80**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 10 | 6602 | Машина деревообрабатывающая ИЭ6009 А-4.1 (2,4кВт), 2007 г. в. | 72,79 | 3,64 |
| 11 | 0181 | Резервуар в комплекте металлический, 1993 г. | 393,26 | 19,66 |
| 12 | 0180 | Резервуар в комплекте металлический, 1993 г. | 393,26 | 19,66 |
| 13 | 0307 | Пресс-ножницы для резки арматуры, 1971 г. | 23,43 | 1,17 |
| 14 | 3024 | Компрессор СО7Б, 1993 г. в. | 200,82 | 10,04 |
| 15 | 7141 | Нагреватель газовый Ecoterm GHD-15, 2015 г. в. | 49,37 | 2,47 |
| 16 | 7140 | Нагреватель газовый Ecoterm GHD-15, 2015 г. в. | 49,37 | 2,47 |
| 17 | 7137 | Нагреватель газовый Ecoterm GHD-15, 2015 г. в. | 49,37 | 2,47 |
| 18 | 6869 | Компрессор СБ-4/С50, 2010 г. | 125,51 | 6,28 |
| 19 | 5232 | Деревообрабатывающий станок С-25-4, 1987 г. в. | 1 924,46 | 96,22 |
| 20 | 5234 | Деревообрабатывающий станок ЦДК-5-2, 1987 г. в. | 1 171,42 | 58,57 |
| 21 | 5140 | Деревообрабатывающий станок ШЛПС-6, 1993 г. | 368,16 | 18,41 |
| 22 | 5061 | Круглопильный станок 2А-1(ЦА2А), 1983 г. | 686,11 | 34,31 |
| 23 | 5450 | Станок сверлильный пазовый СВПА-2, 1972 г. в. | 702,85 | 35,14 |
| 24 | 5435 | Станок фрезерный ФСШ-1А.15, 2008 г. в. | 1 673,45 | 83,67 |
| 25 | 5088 | Станок ЦКБ-40, 1983 г. | 652,65 | 32,63 |
| 26 | 5004 | Станок фрезерный ФСША1, 1987 г. в. | 920,40 | 46,02 |
| 27 | 5320 | Винторезный станок мод. 1622, 1965 г. в. | 1 589,78 | 79,49 |
| 28 | 5021 | Станок для заточки плоских ножей, 2007 г. в. | 543,87 | 27,19 |
| 29 | 5600 | Станок для шлифовки клапанов С-146, 1972 г. в. | 619,18 | 30,96 |
| 30 | 5070 | Станок точильно-шлифовальный модель 38641, 1983 г. | 535,50 | 26,78 |
| 31 | 0312 | Станок вертикально-сверлильный, 1988 г. | 744,68 | 37,23 |
| 32 | 5150 | Станок точильно-шлифовальный 3Б, 1979 г. | 301,22 | 15,06 |
| 33 | 5030 | Растворосмеситель РН-300, 2007 г. | 276,12 | 13,81 |
| 34 | 5031 | Растворосмеситель РН-300, 2007 г. | 276,12 | 13,81 |
| 35 | 2582 | Растворонасос СО 49, 2007 г. | 225,91 | 11,30 |
| 36 | 6768 | Агрегат штукатурно-малярный СО-154А, 2008 г. | 736,32 | 36,82 |
| 37 | 6765 | Смеситель для раствора и бетона СБ-1.00.000, 2008 г. | 184,08 | 9,20 |
| 38 | 6764 | Смеситель для раствора и бетона СБ-1.00.000, 2008 г. | 184,08 | 9,20 |
| 39 | 6777 | Подмости шарнирно-панельный 5500 +2400, 2008 г. | 150,61 | 7,53 |
| 40 | 6771 | Подмости шарнирно-панельный 5500 +2400, 2008 г. | 150,61 | 7,53 |
| 41 | 6833 | Машина мозаично-шлифовальная СО 307, 2009 г. | 234,28 | 11,71 |
| 42 | 5020 | Сварочный полуавтомат 40-170А, 2007 г. | 150,61 | 7,53 |
| 43 | 321 | Станок отрезной по камню ВС-350, 2007 г. | 301,22 | 15,06 |
| 44 | 6763 | Бункер БП-1,6, 2008 г. | 184,08 | 9,20 |
| 45 | 6762 | Бункер БП-1,6, 2008 г. | 184,08 | 9,20 |
| 46 | 6581 | Бункер ТБП-1,6, 2007 г. | 184,08 | 9,20 |
| 47 | 7078 | Виброплита ТР65-4 дв. Хонда Gt160 | 317,96 | 15,90 |
| 48 | 6863 | Мотокоса FS-130STIL, 2010 г. | 117,14 | 5,86 |
| 49 | 6569 | Аппарат высокого давления К-750, 2007 г. | 410,00 | 20,50 |
| 50 | 6810 | Резчик швов CS-146, 2006 г. в. | 167,35 | 8,37 |
| 51 | 6603 | Агрегат отопительный АО-ЭВО.3-24кВТ, 2007 г. | 57,73 | 2,89 |
| 52 | 7136 | Нагреватель газовый Ecoterm GHD-15, 2015 г. в. | 49,37 | 2,47 |
| 53 | 5538 | Универсальный фрезерный станок ФР-676, 1972 г. в. | 1 506,10 | 75,31 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00, ответственное лицо: Рудович Виктор Андреевич, тел. 8 029 647-94-47

**Транспорт, спецтехника, оборудование, расположенное по адресу г. Минск, Бетонный проезд, 11**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 54 | 21364 | Агрегат сварочный АДД-3150, 2001 г. | 317,96 | 15,90 |
| 55 | 21700 | Выпрямитель для дуговой сварки ВДУ-506С, 2006 г. в. | 610,81 | 30,54 |
| 56 | 21721 | Выпрямитель сварочный ВД-306 УЗ, 2007 г. в. | 133,88 | 6,69 |
| 57 | 15013 | Деревообрабатывающий станок МСФШ, 1995 г. в. | 920,40 | 46,02 |
| 58 | 21769 | Лебедка ЛМ-3,2 с редуктором Ц2315 передаточ., 50І7800, 2008 г. | 535,50 | 26,78 |
| 59 | 21768 | Лебедка ЛМ-3,2, с редуктором РМ-500=7800, 2008 г. | 317,96 | 15,90 |
| 60 | 168 | Машина газовой резки НК-12 BETLE портативная, 2014 г. | 184,08 | 9,20 |
| 61 | 21649 | Полуавтомат сварочный ПДГО-510, 2006 г. | 142,24 | 7,11 |
| 62 | 143 | Сварочный аппарат JASIC ARS 250, 2012 г. | 192,45 | 9,62 |
| 63 | 21387 | Станок 4-сторонний МП9-1675, 1996 г. в. | 1 924,46 | 96,22 |
| 64 | 21771 | Станция насосная, сер. № 050536, 2008 г. | 1 255,09 | 62,75 |
| 65 | 21772 | Станция насосная, сер. № 0508317, 2008 г. | 1 255,09 | 62,75 |
| 66 | 27802 | Вращающийся лазер PR 25IF, 2009 г. | 1 200,00 | 60,00 |
| 67 | 21653 | Денситометр индикаторного типа ДНС (по маркировке на изделии ДНС-2), 2006 г. | 258,00 | 12,90 |
| 68 | 21529 | Дефектоскоп магнитопорошковый ПМД-70, 2006 г. | 1 080,00 | 54,00 |
| 69 | 21528 | Дефектоскоп магнитопорошковый ПМД-70, 2006 г. | 1 080,00 | 54,00 |
| 70 | 21524 | Дефектоскоп у/з УД4 Т, 2006 г. | 1 620,00 | 81,00 |
| 71 | 21527 | Дефектоскоп у/з УД4 Т, 2006 г. | 1 620,00 | 81,00 |
| 72 | 153 | Дефектоскоп ультрозвуковой CTS-9006, 2013 г. | 4 200,00 | 210,00 |
| 73 | 21799 | Дистанционный лазерный измеритель PD-42, 2009 г. | 360,00 | 18,00 |
| 74 | 21702 | Дозиметр рентгеновского и гамма-излуч. ДКС-АТ1121, 2007 г. | 1 800,00 | 90,00 |
| 75 | 21635 | Камера сушильная КС 0,25/5,0-400, 2006 г. | 840,00 | 42,00 |
| 76 | 21531 | Нутромер НМ-4000, 2006 г. | 600,00 | 30,00 |
| 77 | 21530 | Нутромер НМ-2500, 2006 г. | 294,00 | 14,70 |
| 78 | 128 | Прибор ТКА-ПКМ, 2012 г. | 120,00 | 6,00 |
| 79 | 21636 | Рентгеновский аппарат «Ратмир» 190П, 2006 г. | 1 080,00 | 54,00 |
| 80 | 146 | Сварочный аппарат JASIK ARC 350, 2012 г. | 336,00 | 16,80 |
| 81 | 145 | Сварочный аппарат JASIK ARC 350, 2012 г. | 336,00 | 16,80 |
| 82 | 15001 | Станок вертикально-сверлильный 2Б125, 1990 г. | 432,00 | 21,60 |
| 83 | 5031 | Станок модельный ЗТ-634, 1988 г. | 600,00 | 30,00 |
| 84 | 5064 | Станок МП9-1695, 1996 г. | 1 740,00 | 87,00 |
| 85 | 21373 | Станок ножовочно-отрезной 872Н, 1981 г. | 204,00 | 10,20 |
| 86 | 21390 | Станок универсальный КСМ-180, 1994 г. | 840,00 | 42,00 |
| 87 | 21378 | Токарно-винторезный станок 1М61П, 1986 г. | 1 980,00 | 99,00 |
| 88 | 21525 | Толщиномер ультразвуковой ТУЗ-2, 2006 г. | 174,00 | 8,70 |
| 89 | 21526 | Толщиномер ультразвуковой ТУЗ-2, 2006 г. | 174,00 | 8,70 |
| 90 | 165 | Толщиномер ультразвуковой CTS-30 B, 2014 г. | 468,00 | 23,40 |
| 91 | 21652 | Шкаф сушильный для р/пленки ШСРП, 2006 г. | 480,00 | 24,00 |
| 92 | 21523 | Эндоскоп гибкий ЭТГ-10-2.7, 2006 г. | 1 620,00 | 81,00 |
| 93 | 21762 | Агрегат сварочный TS300SC/EL400T23OMX3DEV с тележкой СТМ300 | 6 300,00 | 315,00 |
| 94 | 997 | Автомобиль грузовой бортовой, МАЗ 533603-220, 2007 г., рег. номер АВ 0450-7 | 4 497,60 | 224,88 |
| 95 | 118 | Автомобиль GAZ-2705, 2011 г., рег. номер АК 6489-7 | 5 124,00 | 256,20 |
| 96 | 21466 | Автобус-вагон GAZ-22171, 2001 г., рег. номер АК 3962-7 | 1 692,60 | 84,63 |
| 97 | 21792 | Агрегат сварочный SOOSC/EL400T230MX3DEY с тележкой СТМ300 | 6 660,00 | 333,00 |
| 98 | 3274 | Трубогиб «Спрут» | 180,00 | 9,00 |
| 99 | 21377 | Ножницы кривошипные НД-3316Г | 1 320,00 | 66,00 |
| 100 | 18111 | Гидравлический подъемник АГП 20-2 | 15 360,00 | 768,00 |
| 101 | 138 | Полуавтомат сварочный Origo Mig C340PRO | 1 380,00 | 69,00 |
| 102 | 21721 | Выпрямитель сварочный ВД-306 УЗ | 348,00 | 17,40 |
| 103 | 21376 | Пресс гидравлический П-6324 | 2 160,00 | 108,00 |
| 104 | 21374 | Пресс-ножницы С-229А | 456,00 | 22,80 |
| 105 | 2263 | Электролебедка ЛМ-3 г/п 1,2 т | 924,00 | 46,20 |
| 106 | 27775 | Станция насосная | 1 008,00 | 50,40 |
| 107 | 112 | Полуприцеп MAZ 938662 (рег. знак А 6269 А-5), 2010 г. | 2 144,12 | 107,21 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00, ответственное лицо: Рудович Виктор Андреевич, тел. 8 029 647-94-47

**Транспорт, спецтехника, оборудование, расположенные по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г. п. Руба, ул. Центральная, д. 33**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 108 | 21737 | Выпрямитель сварочный ВД-306УЗ | 312,00 | 15,60 |
| 109 | 21698 | Выпрямитель сварочный ВДМ-1202С | 960,00 | 48,00 |
| 110 | 21513 | Домкрат г/п 200 т | 780,00 | 39,00 |
| 111 | 21512 | Домкрат г/п 200 т | 780,00 | 39,00 |
| 112 | 21514 | Домкрат г/п 200 т | 780,00 | 39,00 |
| 113 | 20821 | Домкрат гидравлический ДГ-100 | 558,00 | 27,90 |
| 114 | 21434 | Домкрат реечный ДР-8М | 246,00 | 12,30 |
| 115 | 20822 | Лебедка электрическая 0,3 т | 546,00 | 27,30 |
| 116 | 1354 | Маслостанция УТ-400 | 840,00 | 42,00 |
| 117 | 1355 | Пила маятниковая | 720,00 | 36,00 |
| 118 | 1338 | Станок ЗК-634 | 840,00 | 42,00 |
| 119 | 4642 | Станок токарно-винторезный 1К62 | 3 000,00 | 150,00 |
| 120 | 1348 | Электротельфер г/п 1 т | 300,00 | 15,00 |
| 121 | 1356 | Прицеп 2ПТС-4 (рег. знак ВА 0324), 1988 г. | 600,00 | 30,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Вершибалюк Михаил Михайлович, тел. +375 29-668-16-26

**Транспорт, расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Климовичи, ул. Северная, д. 1**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 122 | 5045 | Автомобиль RAF 2203, рег. знак 9988 АМ-7 | 924,00 | 46,20 |
| 123 | 6032 | Автомобиль ГАЗ 32213, рег. знак АА 3643-7 | 1 176,00 | 58,80 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Чурсин Сергей Геннадьевич, тел. 8 029 375-41-72

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** по лотам **№№ 1–3** не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи). По лотам **№№ 4–123** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 28.05.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **10.07.2019** в 11.00 по адресу: **г. Минск, Бетонный проезд, 17, ОАО «СПЕЦРЕМОНТ»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **05.07.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении 2 июля 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
|---|
| Грузовая специальная машина дорожная комбинированная на базе MAZ 6303 A5-352, год выпуска – 2010, регистрационный знак АВ 9188-4, инвентарный номер 047428 |
| Местонахождение: Гродненская обл., г. Лида, проспект Победы, 168-6 |
| Начальная цена: 69 666,40 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 7 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **2 июля 2019 года** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 19.06.2019 по 28.06.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (033) 333-80-52 (ОАО «ДСТ № 7»)

XV Рэспубліканскі экалагічны форум. Вынікі

# НАВАГРУДАК — МЕСЦА КАМФОРТНАГА ЖЫЦЦЯ

## «Зялёная эканоміка» — стратэгічна важнае паняцце для горада

**Месцам правядзення XV Рэспубліканскага экалагічнага форуму Навагрудак быў абраны невыпадкова. Гэты старажытны горад паспяхова асвойвае сучасныя «зялёныя» тэхналогіі. Менавіта тут дзейнічае самы вялікі ветрапарк Беларусі, які складаецца з 20 ветраэнергетычных установак. З 2013 года Навагрудак з'яўляецца бокам «Пагадненне мэраў».**






### Горад для людзей

На палях экалагічнага форуму мясцовыя ўлады дзяліліся сваім вопытам работы, накіраванай на дасягненне Мэт устойлівага развіцця і выканання нацыянальных абавязацельстваў па Парыжскай дамове. Навагрудак паставіў перад сабой амбіцыйную задачу — стаць месцам камфортнага жыцця для гараджан і гасцей. Пры распрацоўцы мясцовых праграм развіцця гарадскія ўлады ўлічваюць меркаванне жыхароў Навагрудка. З гэтай мэтай праводзіліся апытанні насельніцтва аб камфортнасці горада, яго раёнаў і дваровых тэрыторый. У асноўным людзі пазітыўна ацанілі гарадское асяроддзе, але і абазначылі нявырашаныя праблемы. Атрыманая «зваротная сувязь» ад насельніцтва выкарыстоўваецца гарадской адміністрацыяй пры распрацоўцы плана зялёнага горадабудаўніцтва.

### «Зялёная» — значыць эканамічна выгадная

Стратэгічна важнае паняцце для Навагрудка —— «зялёная эканоміка». У горадзе распрацаваны «План дзеянняў па ўстойлівым энергетычным развіцці», з асноўным акцэнтам на скарачэнне энергаспажывання, выкідаў $CO_2$. У прыватнасці, горад узяў абавязацельства да 2020 года знізіць выкіды на 25 тыс. тон.

«Энергаэфектыўнае асвятленне, ветрагенератары, станцыі сонечных батарэй, цеплаабменнікі, утылізацыя адходаў, падтрымка экатурызму — усе гэтыя паняцці ўжо сталі для Навагрудка рэальнасцю. Горад імкнецца выкарыстоўваць усе магчымыя крыніцы для ўкаранення інавацый, каб рухацца да «разумнага» і «зялёнага» горада, — сказала **першы намеснік старшыні Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта Алена СЯЛЕВІЧ.** — Па выніках работы па «Пагадненні мэраў», зніжэнне выкідаў вугляхлістага газу ад праведзеных мерапрыемстваў за мінулы перыяд склала больш за 46 тыс. тон».

У горадзе і Навагрудскім раёне рэалізаваны шэраг ініцыятыў, накіраваных на энергазберажэнне. Напрыклад, у дзіцячым садзе № 10 устаноўлены сонечныя вакуумныя калектары для падагрэву вады ў басейне, які ў такім выглядзе функцыянуе з 2014 года. Эканамічны эфект ад інавацыі складае 1350 долараў ЗША. У гарадскім пасёлку Любча замянілі 150 звычайных свяцільнікаў на энергаэфектыўныя. Там жа на скрыжаваннях дарог устаноўлены свяцільнікі з аўтаномнымі крыніцамі энергіі — сонечнымі батарэямі і назапашвальнікамі энергіі. Эканамічны эфект — зніжэнне энергаспажывання ў 1,5 раза, а асветленасць вуліц павялічылася ў два разы. На гэты праект былі выдзелены малы грант ПРААН ГЭФ. Агульны кошт праекта — 84 тысячы долараў ЗША з улікам суфінансавання.

Практычна з любога пункту горада бачныя ветрагенератары. Гэтыя ўстаноўкі належаць розным уласнікам, у тым ліку прыватным кампаніям, і разам яны здабываюць «зялёную» энергію. На Навагрудчыне засяроджаны 31 % усёй ветраэнергетыкі, што выпрацоўваецца ў нашай краіне. У 2018 годзе быў рэалізаваны праект ЕС «Зялёная эканоміка» — будаўніцтва ветрагенератарнай установкі магутнасцю 2,5 МВт, фінансаванне Еўрасаюза склала 4,3 млн еўра.

Таксама ў рэгіёне дзейнічае адна сонечная станцыя магутнасцю 1,25 МВт. Сумарная магутнасць «зялёнай» энергетыкі зараз складае 33,3 МВт. Энергія сонца выкарыстоўваецца, напрыклад, для забеспячэння гарачага водазабеспячэння цэнтральнай раённай бальніцы.

### Другасную сыравіну — на перапрацоўку

У 2016 годзе ў горадзе пачала дзейнічаць станцыя па сартаванні цвёрдых камунальных адходаў, праектная магутнасць якой складае да 5000 тон у год. Варта падкрэсліць, што гэты аб'ект быў пабудаваны на ўласныя сродкі горада, а на набыццё часткі абсталявання было прыцягнута фінансаванне ў памеры 37 тысяч долараў ЗША з боку Апаратара другасных матэрыяльных рэсурсаў. На сартавальнай станцыі створана 15 новых рабочых месцаў.

У Навагрудку абсталяваны кантэйнерныя пляцоўкі для раздзельнага збору адходаў. Пры гэтым вельмі важна, што людзі ўмеюць імі карыстацца. Існуе меркаванне, што старэйшае пакаленне з цяжкасцю прыстасоўваецца да новых правілаў, якія рэгулююць раздзельны збор смецця. Дык вось, літаральна за гадзіну прагулкі па горадзе давялося ўбачыць пенсіянера, які нёс два пакеты: з празрыстымі пластыкавымі бутэлькамі і са шкляной тарай. Горад мае парк смеццявозаў, кантэйнераў, таксама вагі і прэс, якія закуплены на сродкі Еўрасаюза ў памеры 779 тысяч еўра.

У горадзе наладжана сістэмная асветніцкая работа, таму жыхары Навагрудка даволі прасунутыя людзі ў пытанні распараджэння другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі. Для іх не быў дзівам тарамат, які прывезлі на выстаўку форуму. Ён працаваў у поўную сілу: людзі неслі ўсё, што гэтая разумная машына прымала — шкло, пластык.

### Партнёрства — шлях да поспеху

Навагрудак актыўна наладжвае міжнароднае супрацоўніцтва: далучыўся да ініцыятыў «Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі» і «Мэры за эканамічны рост», «Горад, дружалюбны дзецям».

Адразу пасля форуму на грамадскія слуханні ў Навагрудку быў прадстаўлены адкарэктаваны план «зялёнага» горадабудаўніцтва, распрацаваны сумесна з камандай праекта ГЭФ — ПРААН — Мінпрыроды. Перад яго распрацоўкай быў праведзены аналіз стану горада па чатырох кірунках: людзі, прырода, эканоміка, кіраванне з выкарыстаннем індыкатараў «зялёнага» горада, якія перасякаюцца з індыкатарамі Мэт устойлівага развіцця. Распрацаваны карты па шчыльнасці насельніцтва, размяшчэння крыніц выкідаў $CO_2$, даступнасці зялёных насаджэнняў і прыпынкаў грамадскага транспарту і г. д. Жыхары маюць доступ да гэтых карт у рэжыме анлайн.

«Для рэалізацыі нашых ідэй выкарыстоўваем не толькі бюджэтныя рэсурсы, але і прыцягваем прыватныя інвестыцыі, розныя віды міжнароднай тэхнічнай дапамогі, — сказала Алена Сялевіч. — Мы ўкладваем гэтыя сродкі ў аб'екты сацыяльнай, гарадской інфраструктуры, адукацыю, развіццё турызму — кірункаў работы шмат».

У сваёй дзейнасці па ўстойлівым развіцці горада мясцовыя ўлады прытрымліваюцца трох асноўных правілаў: выкарыстоўваць інавацыі ў развіцці і ўжо сёння рабіць тое, пра што іншыя будуць думаць заўтра; развіваць супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі бакамі і ажыццяўляць сістэмны падыход да размеркавання рэсурсаў для каардынацыі і эфектыўнасці дзеянняў. Тут створаны пашпарт тэрытарыяльна-арыентаванага развіцця. Распрацаваны стратэгія развіцця аднаўляльных крыніц энергіі да 2030 года, план «зялёнага» горадабудаўніцтва, экатурыстычная і маркетынгавая стратэгія для заказніка «Свіцязянскі». Гэтыя дакументы — «дарожная карта» для мясцовай улады, якая дазваляе падтрымліваць сувязь з насельніцтвам, каардынаваць работу сваіх падраздзяленняў, наладжваць партнёрскія сувязі. Па словах Алены Сялевіч, добра наладжана ўзаемадзеянне з Навагрудскай раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Правядзенне XV Рэспубліканскага экалагічнага форуму ў Навагрудку — гэта не толькі нагода сустрэцца з калегамі і абмеркаваць рабочыя пытанні, гэта і свята для жыхароў, якія любяць свой горад.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

# Будучыня побач

## Аб чым гаварылі на экалагічным форуме

**На XV Рэспубліканскім экалагічным форуме ў Навагрудку разглядаліся і глабальныя, і лакальныя пытанні. Спецыялісты прыродаахоўных службаў Рэспублікі Беларусь, краін СНД і іншых замежных краін, прадстаўнікі арганізацый, прадпрыемстваў і грамадскіх аб'яднанняў дзяліліся набытым вопытам у розных сферах, абмяркоўвалі новыя тэхналогіі і спосабы іх укаранення.**

Калі паслухаць выступленні многіх з іх, ствараецца адчуванне, што будучыня настае ўжо сёння. Найноўшыя распрацоўкі зялёнай энергетыкі можна ўсталяваць у сябе дома ўжо зараз, і гэта даступна сярэдняму класу нашых жыхароў. Для тых, хто пакуль не гатовы да такіх радыкальных крокаў, можна проста энергаэфектыўна ўладкаваць свой побыт. Зразумела, існуе цэлы шэраг праблем на шляху зялёнага прагрэсу: пытанні, як і іх рашэнні, агучылі спецыялісты міжнароднага класа.

### Экалагічныя рашэнні

**Уладзімір РАК, спецыяліст Цэнтра экалагічных рашэнняў,** многае расказаў аб выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі і павышэнні энергаэфектыўнасці ў хатняй гаспадарцы. Можна пачаць з малога. Асвятленне неабходна зрабіць эканомным. Сёння гэта проста: набыць лямпы любога тыпу (напальвання, люмінесцэнтныя, святлодыёдныя) можна ў любой краме прамысловых ці гаспадарчых тавараў. Таксама можна замяніць або звярнуць увагу пры куплі на індукцыйную пліту замест састарэлай электрапліты.

А ўстаноўка аэратара на змяшальнікі, таксама як і ўстаноўка аднарычажных змяшальнікаў, будзе актыўна спрыяць водазберажэнню. Устаноўка рэсурсазберагальнага сантэхнічнага абсталявання не будзе дарагой, але дазволіць значна сэканоміць на спажыванні вады.

Цеплаcпажыванне ў дамах і кватэрах можна і трэба зніжаць. Гэта дазволяць зрабіць няхітрыя маніпуляцыі з экранам на батарэі.

Што датычыцца ўкаранення цеплавых помпаў і геліякалектара, як і набыцця сістэмы сонечнай генерацыі, то ў нашай краіне прапануюць іх установку «пад ключ». Зразумела, гэта нятанныя паслугі, але яны ўжо запатрабаваныя і займаюць сваю нішу на рынку.

### Лічбы сведчаць

Індэкс дасягнення глабальных Мэт устойлівага развіцця (SDG Index) разлічваецца для 156 краін свету на аснове 100 паказчыкаў, звязаных з выкананнем Мэт устойлівага развіцця (МУР). У 2018 годзе Беларусь заняла 23-е месца (76 балаў са 100) і ў цэлым атрымала адзнаку вышэйшую за сярэднюю па рэгіёне Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі (69,5).

А вось згодна з Дакладам-2018, Беларусь пагоршыла займаныя пазіцыі ў рэйтынгу індэкса экалагічнай эфектыўнасці за апошнія дзесяцігоддзе з 34 месца да 44-а. Зніжэнне пазіцыі Беларусі ў большай ступені выклікана павелічэннем выкідаў $CO_2$ (пагаршэнне на 12 пазіцый), інтэнсіўнасцю выкідаў тэхнічнага вугляроду (на 48 пазіцый), інтэнсіўнасцю выкідаў $SO_2$ (на 40 пазіцый), інтэнсіўнасцю выкідаў NOX (на 30 пазіцый).

### Праблема / Рашэнне

**Вера СЫСОЕВА, нацыянальны кансультант па зялёным горадабудаўніцтве,** сцвярджае, што развіццё малых гарадоў — неад'емная частка дзяржаўнай рэгіянальнай палітыкі:

— Не існуе ўніверсальнага падыходу да развіцця малых гарадоў. Мы павінны самі прыдумаць, як раскрыць тэрытарыяльны патэнцыял у гарадскіх стратэгіях прасторавага развіцця. Пры гэтым трэба абавязкова задзейнічаць патэнцыял гарадской супольнасці.

Спецыяліст адзначае, што ў нашай краіне існуе тэхналагічная адсталасць і значны знос абсталявання, беспрацоўе, нізкія даходы. Ускладняе сітуацыю адток працаздольнага насельніцтва і адукаваных кадраў у вялікія гарады. У малых і сярэдніх гарадах часта сутракаецца нізкі ўзровень транспартнага абслугоўвання і слабая даступнасць тэрыторый, адсутнасць якаснага жылля.

— Дэфіцыт мясцовага бюджэту і недастатковая інвестыцыйная прывабнасць праектаў па трансфармацыі забудовы перашкаджаюць развіццю сацыяльнай і інжынерна-транспартнай інфраструктуры. Акрамя таго, праекты, якія залежаць ад дзяржаўных сродкаў, у перыяды эканоміі пакутуюць больш за ўсё, — кажа Вера Сысоева.

Спецыялісты бачаць выйсце ў пераходзе да «зялёнай» эканомікі і ўстойлівага нізкавугляроднага развіцця. Яны таксама прапануюць аптымізаваць апарат мясцовага кіравання і абавязкова выканаць ацэнку спецыфікі пераходу да ўстойлівага развіцця малых і сярэдніх гарадоў мясцовым супольнасцям.

**Вольга ПРАЛЮК.**

# РАСЛІНЫ-ПРЫШЭЛЬЦЫ

**Праблеме інвазійных відаў аддаецца ў апошнія гады шмат увагі. Што ж такое інвазійны від? Гэта не проста чужародная расліна, якая вырасла ў нашых умовах, але і дала мноства насення, а гэтае насенне, у сваю чаргу, засяліла велізарныя тэрыторыі. Згаданая група раслін змагла за даволі кароткі перыяд асвоіць нязвыклыя ёй экатопы, а ў шэрагу выпадкаў паспяхова канкурыраваць і з абарыгенным ядром мясцовай флоры.**


Дуб чырвоны.

Трэба адзначыць, што колькасць чужародных раслін з кожным годам пастаянна павялічваецца і праводзіцца пастаянная работа па адсочванні іх паводзін у прыродзе. Яны асвойваюць новыя тэрыторыі за вельмі кароткі час:

— Напрыклад, баршчэўнік трапіў у нашу краіну толькі ў 1954 годзе, — расказвае **Аркадзь СКУРАТОВІЧ, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.** — Навукоўцы атрымлівалі гібрыды, размнажалі гэтую расліну. Справа ў тым, што быў дадзены загад вывесці расліну з высокай ураджайнасцю, каб накарміць жывёлу. Кукуруза дае ўраджай 700 цэнтнераў з аднаго гектара, а баршчэўнік — 1200—1500 цэнтнераў з такой жа плошчы. Але людзі не ўлічылі наступстваў. І зараз любое дакрананне да яго багата вялікімі праблемамі са здароўем.

Спецыяліст сцвярджае, што ва ўласцівасцях гэтай расліны заключаюцца і метады барацьбы з ёю. Бо баршчэўнік пакідае апёкі толькі пры дапамозе сонечных прамянёў, таму барацьбу з ім трэба весці ў цёмны час сутак, тады яго яд не будзе такі актыўны.

Кожны год у Беларусі знаходзяць новыя інвазійныя віды. Іх, магчыма, завезлі даўно, але цяпер яны адаптаваліся і пачынаюць размнажацца ў геаметрычнай прагрэсіі. І справа не толькі ў людзях, якія бяздумна прывозяць экзатычныя расліны, але і ў пацяпленні клімату.

Каноплі пасяўныя былі прывезены ў Беларусь у XIX стагоддзі. З гэтага віду каноплю выраблялі мешкавіну, вяроўкі. Яны лёгка здзічэлі і распаўсюдзіліся.

Сумнік канадскі распаўсюдзіўся нават у Белавежскай пушчы. Яго шмат на былых сельскагаспадарчых угоддзях, якія раней былі закінутыя. На пустуючай зямлі трэба было пасеяць шматгадовыя травы, пасвіць жывёлу, але гэтага не зрабілі своечасова, і расліна-агрэсар заняла тэрыторыю. Нават дрэвы не могуць расці побач з сумнікам, таму што ў каранях гэтай шкоднай расліны ёсць інгібітары, гэта значыць рэчывы, якія запавольваюць рост іншых раслін. Сёння навукоўцы спрабуюць здабыць гэтыя рэчывы ў чыстым выглядзе і выкарыстоўваць супраць самога сумніка.


Лубін шматлісты.

Дуб чырвоны (або паўночны) спее на 20—30 гадоў раней нашага дуба, але пад такімі дубамі не растуць грыбы, травяністыя расліны, таму што пад ім знаходзіцца шчыльны пласт сухога лісця. Такія дрэвы фарміруюць «мёртвыя» лясы.

Лубін шматлісты мае выдатныя ўласцівасці: забірае азот з паветра і назапашвае ў глебе. У гэтай расліне шмат вады. Калі яго пасадзіць у сасонніку, то можна не баяцца пажараў. Але калі такая расліна выйдзе на ўзлесак, то застануцца толькі гэтыя расліны, астатнія не выжывуць.

Адзначым, што большая частка згаданых інвазійных відаў раслін распаўсюдзілася ў Беларусі ў асноўным у сярэдзіне XX стагоддзя. Гэта часцей за ўсё выхадцы з Паўночнай Амерыкі, краін Паўднёвай і Заходняй Еўропы, Цэнтральнай Азіі. Яны актыўна канкурыруюць з абарыгенным ядром флоры, выцясняючы віды, якія раслі спрадвеку на лугах, лясах, берагах вадаёмаў і вадацёкаў.


Сумнік канадскі.

У далейшым, у сувязі з пацяпленнем клімату і павелічэннем антрапагенных нагрузак на натуральныя экатопы, навукоўцы прагназуюць павелічэнне колькасці інвазійных раслін.

**Вольга ПРАЛЮК.**
**Фота Аркадзя СКУРАТОВІЧА.**

# БАРШЧЭЎНІК НЕ ЗДАЕЦЦА, АЛЕ ПАКУЛЬ...

**На поўначы краіны самы вялікі «фронт работ» у барацьбе з інвазійнай раслінай. З ёй змагаюцца нават з дапамогай квадракоптара.**

Вопыт Віцебшчыны ў знішчэнні баршчэўніку цікавы таму, што тут больш за 80 працэнтаў зараснікаў ад агульнага па краіне. Расліна-паразіт расце на плошчы каля трох тысяч гектараў.

## Фінансаванне павялічваецца

Найбольш праблемнымі з'яўляюцца Ушацкі раён, дзе плошча распаўсюджвання баршчэўніку больш за 1260 га, Віцебскі — каля 521, Гарадоцкі — каля 404,5 гектара.

Як паведаміў старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктар Галанаў, выяўлена 3432 месцы вырастання баршчэўніку Сасноўскага на тэрыторыях 455 землекарыстальнікаў.

У канцы красавіка на пасяджэнні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта разгледжана пытанне аб арганізацыі работ па барацьбе з інвазійнымі відамі раслін. Адказным выканаўцам і службам былі дадзены канкрэтныя даручэнні.

Актуальнае пытанне фінансавання. У раённых і гарадскіх бюджэтах прадугледжаны сродкі на выкананне мерапрыемстваў — больш за 530,7 тысячы рублёў. У тым ліку ў Браслаўскім, Віцебскім, Гарадоцкім, Аршанскім, Ушацкім, Шаркаўшчынскім раёнах і Віцебску. Для параўнання, летась з абласнога бюджэту выдзелена было 310 тысяч рублёў.



Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя на 1 чэрвеня, мерапрыемствы па барацьбе з баршчэўнікам выкананы на плошчы больш за дзве тысячы гектараў. Асвоена 275,5 тысячы рублёў, або 44 % ад прадугледжаных сродкаў.

## Багаты арсенал

Абласнымі службамі і арганізацыямі, іх падначаленымі падраздзяленнямі выкананне работ па барацьбе з інвазійнымі відамі раслін праводзяцца за ўласны кошт.

Так, Віцебскім дзяржаўным лесагаспадарчым аб'яднаннем накіравана на знішчэнне баршчэўніку больш за 40 тысяч рублёў. Леснікі купілі 40 кілаграмаў гербіцыду «Тэрсан» і 40 літраў «Тарнада». Іх уносяць з дапамогай ручных апырскавальнікаў, а таксама паветранадзімалак з падачай вады. Праведзены работы на 293,3 га зямель ляснога фонду.

Змагаюцца з «зялёным ворагам» і дарожнікі. У палосах адводу аўтамабільных дарог выкананы мерапрыемствы на плошчы 55,2 га.

І энергетыкі бяруць удзел у барацьбе з «паразітам». Для выканання гэтых работ у філіялах РУП «Віцебскэнерга» маюцца матакосы, кустарэзы і трактары з навясным абсталяваннем.

Чыгуначнікі вельмі актыўна наводзяць прыгажосць у палосе адводу чыгункі. Віцебскім аддзяленнем БЧ сёлета на правядзенне работ выдаткавана 15 тысяч рублёў. Усяго ў Віцебскай вобласці для правядзення работ выкарыстоўваецца больш за 170 трактароў, абсталяваных касілкамі і навяснымі апырсквальнікамі. У арсенале знішчальнікаў баршчэўніку 184 ранцавыя апырсквальнікі, каля 340 трымераў і бензакос. Набыта 578 кг гербіцыдаў, больш за 2680 літраў гліфасатаў...

У Віцебскім раёне работы на землях сельскагаспадарчага прызначэння праводзяцца ўласнымі сіламі сельскагаспадарчых арганізацый, якім для закупкі гербіцыдаў выдзелена больш за 82,6 тысячы рублёў. На землях сельскіх выканаўчых камітэтаў на конкурснай аснове вызначаны выканаўцы работ на суму каля 37,3 тысячы рублёў. Работы праводзяцца спецыялізаванымі брыгадамі, створанымі на базе Віцебскай ПМС, УП «Вітрайкамгас» (сумесна з райаддзелам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях) і ААТ «Віцебскі райаграсэрвіс».

## Як знішчаюць на Ушаччыне?

Ва Ушацкім раёне за кошт вылучаных бюджэтных сродкаў закуплены гербіцыды «Тэрсан», «Тотал» 480. Работы на землях запасу, а таксама агульнага карыстання населеных пунктаў, сельскагаспадарчага прызначэння агульнай плошчай 505 га выконваюць ратавальнікі. Плануецца дадатковае набыццё 40 кг гербіцыду «Магнум».

Першы намеснік старшыні райвыканкама, начальнік упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Сяргей Садоўскі канстатуе, што для выканання мерапрыемстваў з абласнога бюджэту перададзена ў раёны 226 тысяч рублёў. На работах задзейнічаны тры брыгады па пяць чалавек з мотаапырсквальнікам, трактар з садовым апырсквальнікам. Падраднай арганізацыяй выкананы работы па хімічнай апрацоўцы месцаў вырастання на плошчы 300 га. Работы праведзены на землях сельскагаспадарчага прызначэння, сельсаветаў.

На механічнай апрацоўцы задзейнічаны трактарныя касілкі дарожных арганізацый, прадпрыемства ЖКГ, сельскагаспадарчых арганізацый, а таксама рабочыя лясгаса з мотакосамі і косамі. Сельскагаспадарчыя арганізацыі заворваюць землі, занятыя баршчэўнікам. Усяго заарана 710 га.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Каментарый у тэму

— Планам мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму ўстаноўлены штомесячныя заданні па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага, — гаворыць **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалай СВІДЗІНСКІ.** — У маі запланавана знішчэнне баршчэўніку па ўсёй краіне на плошчы, якая ахоплівае 1817,75 га. Па стане на 1 ліпеня мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага ў цэлым па краіне праведзены на плошчы 2556,53 га, або 140,6 % ад устаноўленага задання. Напрыклад, у месцах адпачынку на водных аб'ектах ліквідаваны зараснікі баршчэўніку на 6,2116 га, што склала 121,5 % ад устаноўленага задання, на сельскагаспадарчых тэрыторыях і аб'ектах — на 1290,4687 га (136,7 %). Выкарыстоўваюцца ўсе магчымыя спосабы выдалення баршчэўніку: механічны, хімічны і камбінаваны. Знішчэнню гэтай інвазійнай расліны аддаецца сур'ёзная ўвага, работа па выкананні мерапрыемстваў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці баршчэўніку Сасноўскага знаходзіцца на кантролі ў тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

Гарачая тэма

# Ці выжыве сатыра юта?

## У лясных пажарах і палах незваротна знікаюць унікальныя біялагічныя віды

**Забарона на наведванне лясоў у засушлівыя перыяды вясны, лета і восені стала для беларусаў звычайнай з'явай. Такое абмежаванне сведчыць пра тое, што ў падпалах (наўмысных або выпадковых) часцей за ўсё вінаватыя людзі. Так, вясной гэтага года ў Рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Альманскія балоты», размешчаным у Столінскім раёне Брэсцкай вобласці, здарыўся маштабны пажар, які прыйшоў з суседняй Украіны і знішчыў усё жывое на тэрыторыі больш за 400 га. Прычыны ўзгаранняў могуць быць розныя — вясновыя палы, летняя спякота і неасцярожна кінуты недакурак, восеньскія наведванні лесу, звязаныя са зборам ягад і грыбоў. Вынік жа адзін — знішчэнне біятопаў і доўгі перыяд біялагічнай рэстаўрацыі.**

### Наступствы для самых безабаронных

Пажары застаюцца адной з самых жудасных з'яў у прыродзе. Яны знішчаюць месца пражывання жывых арганізмаў, у тым ліку прыводзяць да гібелі значнай колькасці насякомых. У першую чаргу ад высокіх тэмператур гінуць нелятаючыя формы, а таксама яйкі, лічынкі і кукалкі. **Анатоль КУЛАК, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі наземных беспазваночных жывёл ДНВА «НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах», кандыдат біялагічных навук**, кажа, што пажары могуць мець і апасродкаваны ўплыў на насякомых праз пераўтварэнне мікрастацый спакою і зімоўкі (выгаранне купін, сцёблаў раслін):

— Напрыклад, у заказніку «Альманскія балоты», які ўяўляе сабой найбуйнейшы ў Еўропе ўчастак палескай мазаікі разнастайных балот і лясоў, пажары прывялі да ўсыхання хвоі на балоце. А гэтыя дрэвы з'яўляюцца ўтваральным фактарам навакольнага асяроддзя для жыцця папуляцый чырванакніжнага віду матылькоў — сатыра юта. Згаданы від жыве на балотах выключна на ўчастках з разрэджанай хвояй, на якую матылі прысаджваюцца для адпачынку. У цяперашні час стан папуляцыі гэтага рэдкага віду ў заказніку невядомы.



Анатоль Віктаравіч называе сапраўднай дзікасцю падпалы жывых дуплаватых дрэў, якія часам заканчваюцца ўзгараннем цэлых лясных масіваў:

— У дуплах гняздуюцца не толькі совы і шэршні, але і велізарная колькасць відаў карысных і рэдкіх насякомых, многія з якіх знаходзяцца пад рэжымам спецыяльнай аховы. Напрыклад, жукі: васковікпустэльнік, бронзаўка вялікая зялёная, васковік-стракатка зменлівая. У 2007 годзе ў ваколіцах вёскі Пхоў (Гомельская вобласць) такі пажар знішчыў асяроддзе пражывання цэлай чарады матылькоў, якія ахоўваюцца ў многіх краінах Еўропы: зяноўнікавай жаўтушкі, чарнаватай блакітніцы, блакітніц алькон і арыён. Тры першыя віды ахоўваюцца ў Беларусі.

Магчыма, менавіта з-за пажараў на стыку XX і XXI стагоддзяў спынілася існаванне рэдкіх перламутравак фрыгі і фрэі на балоце Вуліца ў Старадарожскім раёне Мінскай вобласці. Неабходна памятаць, што нават кінутая шкляная бутэлька можа спрацаваць як аптычная лінза, якая збірае сонечныя прамяні ў тонкі гарачы пучок святла, здольны запаліць торф або сухі лясны апад.

### Лугавое разнатраўе

Большасць відаў дзённых матылькоў, пчолы, чмялі, мухі і іншыя казуркі ва ўмераных шыротах трымаюцца лугавой расліннасці, ускраін лясоў, закінутых пустак — тут дарослыя казуркі знаходзяць сабе і сваім нашчадкам пражытак.

Але тысячы куткоў нашай краіны становяцца беднейшымі з-за вясновага выпальвання сухой травяністай расліннасці. «Гаспадары», думаючы акультурыць і ўгнаіць попелам пакосы, праз дзясятак гадоў штогадовага выпальвання расліннасці атрымліваюць зусім не тое, што чакалі: замест багатых укосаў травы — бедныя землі. Справа ў тым, што карэнне і насенне многіх траў выгараюць, гінуць казуркі — апыляльнікі кветкавых раслін, а таксама карысныя рыхлільнікі глебы — дажджавыя чарвякі і клубеньковыя бактэрыі. У выніку атрымліваюцца тэрыторыі з нізкапрадукцыйнымі жорсткімі травамі, якія потым пакрываюцца пустазеллем, а затым і зусім закідваюцца і зарастаюць хмызнякамі і дрэвамі.

Але тэрыторыя нашай краіны размешчана ў ляснoй зоне, дзе лугам адведзена другарадная роля. Карэнныя лугі ў Беларусі раскінуліся толькі там, дзе дрэвы не знаходзяць добрых умоў для існавання — у поймах рэк. Таму абкошванне палян, ускраін лясоў, узгоркаў са стромкімі схіламі, выпас жывёл у такіх месцах на працягу многіх стагоддзяў вызвалялі зямлю ад драўняна-хмызняковай раслінасці.

З канца XX стагоддзя плошча дробнаконтурных сенажацяў у Беларусі скарацілася ў некалькі разоў, такія ўчасткі моцна параслі хмызняком, пaступова ператвараючыся ў лес. Сёння былыя сенажакамі, якія сталі нікому не патрэбныя, адкрытыя схілы пагоркаў актыўна пакрываюцца густымі лесапасадкамі. Паралельна змене раслінасці адбываецца і змена відавога складу і страта ўнікальнасці супольнасцяў насякомых (значна знізілася колькасць дзённых матылькоў, пчол, чмялёў — апыляльнікаў кветкавых раслін).





Бронзаўка зялёная.

### Палы пад кантролем

Дзіўна, але прырода «ведае» і гаючыя для біялагічнай разнастайнасці ўласцівасці пажараў. Прыкладам для навукоўцаў паслужылі саваны, пакрытыя травяністай і моцна прарэджанай драўняна-хмызняковай раслінасцю ў субэкватарыяльным поясе з рэзкім падзелам года на сезоны дажджоў і засухі. Расліны, якія растуць у саванах, і жывёлы, якія іх насяляюць, адаптаваныя да прыродных пажараў — іх эвалюцыя адбывалася пад «кантролем» агню. Цяпер навукоўцы паспяхова рэканструююць каштоўныя травяністыя супольнасці, выкарыстоўваючы накіраваныя палы. Вялікі пазітыўны вопыт у гэтай справе есць у цэнтральных і паўднёвых абласцях Еўрапейскай Расіі пры рэстаўрацыі стэпавых экасістэм.

Не абышлі бокам тэму «тэрапеўтычнага» эфекту пажараў на прыродныя супольнасці і беларускія навукоўцы. Вопытным шляхам яны даказалі, што ва ўмовах дастатковага ўвільгатнення ранніх (па апошнім снезе), перыядычныя накіраваныя палы на нізінных балотах прыводзяць да памяншэння непажаданай вялікіх плошчаў кустоў і трыснягу і адначасова да павелічэння долі асачнікаў, як, напрыклад, у Рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Званец». Гэта паляпшае ўмовы пражывання для многіх рэдкіх відаў жывёл (напрыклад, вяртлявай чаротаўкі).

Адзначым, што ў асобных выпадках і па-за балотамі кантраляваныя пажары на невялікіх тэрыторыях паявлічваюць мазаічнасць ландшафтаў і біяразнастайнасць. Напрыклад, дрэвастой шыракалістых парод і хвоі, пашкоджанай або саслабленай пажарамі, у заказніку «Альманскія балоты» з'яўляецца выдатным субстратам для развіцця многіх відаў насякомых з Чырвонай кнігі Беларусі і Чырвонага спісу Міжнароднага саюза аховы прыроды. Тут адзначаны восем чырванакніжных відаў цвердакрылых, якія развіваюцца ў пашкоджанай драўніне. Прычым пяць з іх, з жуком-аленем і зменлівай стракаткай уключна, зрабіліся адносна звычайнымі для заказніка. Аднак пры разглядзе доўгатэрміновага развіцця гэтых відаў палы шкодныя, паколькі занадта частыя пажары, хутчэй за ўсё, падрываюць аднаўленне кармавой базы і негатыўна ўплываюць на развіццё лічынак.

— Некаторы час таму, — успамінае Анатоль Кулак, — побач з Мінскам, каля вёскі Калодзішчы, існаваў вайсковы палігон, на тэрыторыі якога жылі прыродныя супольнасці, незвычайна багатыя на чырванакніжныя і рэдкія для Еўропы віды. Пасля спынення вучэбных ваенных дзеянняў пачалося натуральнае зарастанне адкрытых лугавін і верасовых пустак вербалозам, хвояй, асінай, бярозай. Цяпер усё радзей і радзей там сустракаюцца архідэі ятрышнік аблапены, пылкагалоўнік даўгалісты, арніка горная, гарычавачка гаркаватая, лілея кучаравая («царскія кучары») і многія іншыя рэдкія расліны. Практычна зніклі рэдкія блакітніца алексіс, шашачніца, махаон. А пакуль толькі тут з усёй тэрыторыі Беларусі выяўлены надзвычай рэдкі ў Еўропе начны матылёк — пядзенік. У свой час батанікі і энтамолагі рэкамендавалі далучыць гэтую унікальную тэрыторыю да суседняга біялагічнага заказніка «Глебкаўка» і прапісаць для яе правядзенне навукова абгрунтаваных дробнаконтурных выпальванняў. Але нават такія накіраваныя палы не могуць паўнавартасна замяніць пакосы і выпас буйной рагатай жывёлы.

### Гісторыя пажараў на Альманах

Некантралюемае наведванне чалавекам у сукупнасці з экстрэмальнымі пагодна-кліматычнымі ўмовамі апошніх гадоў прывялі да спусташальных лясных і тарфяных пажараў, якія знішчылі біяразнастайнасць на значнай частцы асаблівa ахоўнай прыроднай тэрыторыі Альманскіх балот. Беларускія навукоўцы Сяргей Русецкі, Дзмітрый Жылінскі і Дзмітрый Грумо з Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі на аснове архіва праграмы Landsat выканалі рэканструкцыю гісторыі пажараў на тэрыторыі гэтага лесабалотнага комплексу за перыяд 1985—2018 гадоў.

Яны высветлілі, што найбольш інтэнсіўныя пажары праходзілі ў 1995 годзе (10,7 тыс. га), 2002-м (12,4 тыс. га) і 2015-м (13,4 тыс. га). Таксама было ўстаноўлена, што асноўныя ўчасткі лакалізацыі агню размешчаны ў паўднёвым, заходнім і ўсходнім сектарах ААПТ. Навукоўцы выявілі, што ў гадавым цыкле пажары назіраюцца з канца сакавіка і да пачатку снежня. Пік прыпадае на верасень — верагодна, гэта звязана з найбольш нізкім узроўнем стаяння балотных водаў і са зборам журавін у гэтых месцах.

**Па словах прадстаўніка прэс-службы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталя Навіцкага, тарфяныя пажары складана не толькі ліквідаваць, але і своечасова выявіць, паколькі гарэнне адбываецца пад пластом зямлі. У 90-я гады былі выпадкі гарэння на глыбіні да 15 м!**

Вынікі аналізу карты пажараўстойлівасці раслiннага покрыва (у межах Альманскіх балот) паказалі, што да 1-га класа (найменш устойлівая раслiннасць) адносяцца 5,2 % тэрыторыі; да 2-га (няўстойлівая) — 14,8 %; да 3-га (сярэдняўстойлівая) — 35,2 %; да 4-га (устойлівая) — 22,5 % і да 5-га (найбольш устойлівая) — 22,3 %.

Раслiнныя супольнасці з высокім патэнцыялам прыроднай пажарнай небяспекі (1-ы, 2-і клас устойлівасці) распаўсюджаныя адносна раўнамерна па ўсёй тэрыторыі тэставатага палігона. На аснове заніравання тэрыторыі па класах пажарнай устойлівасці навукоўцы распрацавалі комплекс мер па зніжэнні рызыкі ўзнікнення пазаштатных сітуацый на тэрыторыі лесабалотнага комплексу «Альманскія балоты».

**Вольга ПРАЛЮК.**
**Фота Анатоля КУЛАКА.**

Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# РЭАЛЬНЫ КОШТ НОВАГА СМАРТФОНА

## Як мабільныя тэлефоны забруджваюць навакольнае асяроддзе

**«Сябры, а калі вы апошні раз мянялі свой тэлефон?» — такое пытанне я неяк пачула ў рэкламе. Прэзентавалі чарговую, самую стылёвую і самую функцыянальную, па іх словах, мадэль, якая абавязкова павінна любога вылучыць з натоўпу. Добра, калі так, але такія «самыя-самыя» мадэлі з'яўляюцца амаль кожны месяц. І людзі не проста іх купляюць, некаторыя гатовы прастаяць суткі каля крамы, каб набыць навінку са зніжкай або заплаціць таму, хто зойме ім чаргу. Кожны, вядома, вырашае сам, куды траціць свае грошы. Я ж хачу з вамі пагаварыць пра тое, як такое празмернае спажывальніцтва адбіваецца на навакольным асяроддзі і, як следства, на нашым здароўі.**

Думаю, вы не раз чулі ад бацькоў, маўляў, раней тэхніка была настолькі трывалая, што перадавалася ў спадчыну. У нас, напрыклад, яшчэ працуе прабабулін тэлевізар, тады як сучасны зламаўся праз два гады. Гэта невыпадкова. Каб павысіць попыт, вытворцы наўмысна скарачаюць тэрмін эксплуатацыі прыбораў і называюць гэта «запланаваным састарэннем». Так, часта некаторыя дэталі робяць менш даўгавечнымі, каб за грошы, якія могуць патрацiцца на іх рамонт, прасцей было набыць новы прыбор. Да таго ж нярэдка старыя мадэлі наогул перастаюць падтрымліваць, таму купіць для іх неабходныя запчасткі амаль нерэальна.

А вы калі-небудзь задумваліся, у якіх умовах і з чаго вырабляюцца новыя мадэлі тэлефонаў і што з імі адбываецца, калі мы перастаём імі карыстацца? Дык вось адзін толькі смартфон змяшчае ў сабе палову табліцы Мендзялеева! Здабываюць неабходныя металы (асноўныя з іх — золата, волава, тантал, медзь, серабро, індый), а таксама збіраюць электрапрыборы ў краінах Афрыкі, Азіі і Паўднёвай Амерыкі, дзе вельмі нізкія стандарты працы.

**Лічбы і факты**

Неабходны для вытворчасці мабільных тэлефонаў тантал атрымліваюць з калтанавай руды. 80 % яе запасаў знаходзіцца ў Конга (Афрыка), дзе за кантроль над руднікамі дзесяцігоддзямі вядзецца грамадзянская вайна. Па падліках ЮНІСЕФ, у Конга 40 тысяч дзяцей працуюць на гэтых рудніках.

**Слоўнік**

Стойкія арганічныя забруджвальнікі — гэта небяспечныя хімічныя рэчывы, якія валодаюць высокай таксічнасцю, могуць заставацца ў навакольным асяроддзі на працягу доўгага часу, перамяшчацца на значныя адлегласці і накопліваюцца ў тлушчавых тканках чалавека і жывёл.

**Што рабіць?**

Адходы электроннага і электрычнага абсталявання, у тым ліку і тэлефоны, можна здаць на прадпрыемства «БелВТІ», а акумулятары і батарэйкі выкінуць у спецыяльныя кантэйнеры. Старайцеся свядома падыходзіць да пакупкі электрапрыбораў, бо нават перапрацоўка іх не вырашае праблему. Не так даўно ў дзіцячых таварах, якія былі зроблены з другаснага пластыку ад электронікі, знайшлі стойкія арганічныя забруджвальнікі.

**А вы ведалі?**

Самая вялікая ў свеце звалка электронікі знаходзіцца ў Гане (Афрыка).

Паводле звестак ААН, кожны год у свеце выкідваецца каля 50 мільёнаў тон электронных адходаў, і толькі 20 % з іх бяспечна ўтылізуецца. Большая частка электронікі, якая ўтрымлівае ў сабе свінец, кадмій, ртуць, берылій, ідзе на звалку. Як правіла, такое смецце экспартуецца ў краіны Афрыкі і Азіі, дзе яго захаванне каштуе вельмі танна. Для гэтага ўжо нерабочую тэхніку памячаюць як тавар «сэкандхэнд», бо згодна з палажэннямі Базельскай канвенцыі аб кантролі за трансгранічнай перавозкай небяспечных адходаў і іх выдаленнем, экспарт такой электронікі забаронены.

**Маша ЗЯЛЁНАЯ.**

**Важна**

Здабыча металаў суправаджаецца забруджваннем навакольнага асяроддзя злучэннямі ртуці і серы, а таксама цяжкімі металамі.

Парадак на зямлі

# Вялікія справы робяцца маленькімі крокамі



**Школьнікі актыўна ўключыліся ў работу па навядзенні парадку на зямлі, прымаючы ўдзел у акцыі «Зробім Беларусь чысцейшай». Сваімі гісторыямі ўдзельнікі акцыі з усіх куткоў краіны дзеляцца з часопісам «Родная прырода».**

Невялікую зялёную зону каля станцыі метро «Магілёўская» гараджане аблюбавалі для адпачынку на прыродзе. Некаторыя з іх пакідаюць пасля сябе смецце: пластыкавыя бутэлькі, упакоўкі ад прадуктаў. «Каб наш маленькі сквер пазбавіўся ад пластыку і стаў чысцейшы, нам спатрэбілася ўсяго толькі адна гадзіна, — разказвае **кіраўнік аб'яднання па інтарэсах «ЭкаКрайGroup» аддзела экалогіі і аховы прыроды сталічнага Палаца дзяцей і моладзі «Золак» Лізавета СЯДОВА.** — Сваёй работай мы засталіся задаволеныя. Некалькі пакетаў з пластыкавымі адходамі і іншым смеццем самастойна рассартавалі ў рознакаляровыя кантэйнеры. Цяпер можна смела выходзіць на шпацыр і любавацца чысцінёй».

А навучэнцы ДУА «Светлагорскі эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і моладзі» сумесна з педагогамі ўдзельнічалі ў акцыі па навядзенні парадку каля стадыёна «Папернік». Стадыён знаходзіцца недалёка ад экалагічнага цэнтра і з усіх бакоў акружаны ляснымі насаджэннямі. Гэтая тэрыторыя вельмі шматлюдная, таму што жыхары горада скарачаюць шлях праз гэты ўчастак пры пераходзе з аднаго мікрараёна ў другі. На жаль, па дарозе і смецяць.

У Ліплянскай сярэдняй школе лічаць, што навядзенне парадку на зямлі — гэта не толькі дзяржаўная палітыка, але і справа кожнага чалавека. Таму школьнікі разам з педагогамі зрабілі генеральную уборку ў сваёй вёсцы, ачысцілі ад смецця лес.

Навучэнцы ДУА «Маркоўскі дзіцячы сад-базавая школа» не засталіся ўбаку ад акцыі «Зробім Беларусь чысцейшай». Вучні, педагогі і тэхнічны персанал школы ініцыявалі ўборку тэрыторыі роднай вёскі. Яны прыбралі смецце ўздоўж цэнтральнай вуліцы, навялі парадак на левым беразе ракі. На школьнай тэрыторыі разбілі клумбы, пасадзілі кветкі. Таксама добраўпарадкавалі воінскія пахаванні ў вёсках Картынічы і Асянское, навялі парадак на мясцовых могілках. Школьнікі дапамаглі састарэлым аднавяскоўцам прыбрацца на прыдамавых тэрыторыях. А завяршылася акцыя пасадкай 36 клёнаў і чатырох пладовых дрэў.

Настаўнікі і вучні Зашырскай сярэдняй школы Ельскага раёна Гомельскай вобласці навялі парадак у родным аграгарадку Зашыр'е. Вясной яны добраўпарадкавалі тэрыторыю аднаго з паркаў пасёлка.

Конкурс фотаздымкаў, які праводзіць часопіс «Родная прырода», аб удзеле школьнікаў у акцыі «Зробім Беларусь чысцей» працягваецца. Лісты з невялікім апавяданнем і фатаграфіямі дасылайце на адрас часопіса pryroda@zviazda.by.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**





У Ліплянскай сярэдняй школе.

У свеце жывёл

# СУПЕРГРЫЗУНЫ СЯРОД НАС!

## Эколагі плануюць захаваць рэдкіх звяркоў

**У Беларусі шукаюць хамякоў, суслікаў і палятух — супергрызуноў, якія амаль зніклі з тэрыторыі нашай краіны. Ініцыятыву распачала прыродаахоўная грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) у рамках праекта «Экаманіторынг», што фінансуецца ЕС і рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Мінпрыроды. Каб захаваць рэдкіх звяркоў, спецыялісты просяць дапамогі ва ўсіх неабыякавых!**

Колькі дакладна засталося суслікаў, хамякоў і палятух на тэрыторыі нашай краіны, невядома. Яшчэ ў 1980-х першыя два грызуны лічыліся шкоднікамі сельскай гаспадаркі, таму больш за 90 % іх было знішчана. Палятуха ўвогуле не сустракалася ў Беларусі ажно з 1996 года, пакуль два гады таму спецыялісты АПБ не заўважылі яе на паўночным усходзе краіны. Новая ініцыятыва дапаможа сабраць неабходныя звесткі пра месцы знаходжання жывёл і прыняць меры па іх захаванні.

— Мы зробім апрабацыю сучаснай апаратуры для пошуку і маніторынгу грызуноў, — расказаў **спецыяліст АПБ па прыродаахоўных пытаннях Сямён ЛЕВЫ.** — Квадракоптары дапамогуць нам знайсці калоніі суслікаў і сцяжыны хамякоў на вялікіх тэрыторыях, фотапасткі — атрымаць цікавыя матэрыялы аб пагрозах і біялогіі звяркоў. А праз цеплавізары мы зможам назіраць за хамякамі і палятухамі ўначы, калі яны найбольш актыўныя.



Палятуха.

Дарэчы, супергрызунамі рэдкія звяркі называюцца невыпадкова, кожны з іх валодае сваімі ўнікальнымі суперздольнасцямі. Лётаць, як птушка, палятуха, вядома, не ўмее, але яна можа планаваць свой палёт з дапамогай шырокай скурнай складкі, размешчанай паміж пярэднімі і заднімі лапамі, а яе доўгі хвост дае магчымасць кіраваць траекторыяй палёту. Так яна можа скакаць на адлегласць да 90 метраў.



Хамяк.

Хамяк (самы рэдкі з трох супергрызуноў!) цікавы сваімі вялікімі зашчочнымі мяшкамі, у якіх ён можа пераносіць каля 50 г пшаніцы на адлегласць больш за кіламетр. Таксама гэты звярок здольны рабіць запасы вагой да 20 кг.



Суслік.

А рабы суслік варты ўвагі таму, што змог выжыць пасля актыўнага знішчэння ў савецкія гады.

Шукаць супергрызуноў будуць у кожным шостым раёне Беларусі. Хамяка і сусліка — у Камянецкім, Брэсцкім, Жабінкаўскім, Кобрынскім, Пружанскім, Ляхавіцкім, Баранавіцкім раёнах Брэсцкай вобласці. Суслікі таксама спадзяюцца знайсці ў Навагрудскім, Карэліцкім раёнах Гродзенскай вобласці і Нясвіжскім, Капыльскім, Клецкім, Слуцкім раёнах Мінскай вобласці. Хамяка — у Гомельскім і Добрушскім раёнах Гомельскай вобласці. А пошукі палятухі абвешчаны ў Віцебскім, Гарадоцкім, Шумілінскім, Лёзненскім раёнах Віцебскай вобласці.

— Мы плануем правесці сустрэчы з настаўнікамі, школьнікамі, леснікамі, мясцовымі жыхарамі, каб расказаць ім пра біялогію гэтых відаў і пра тое, што ім пагражае. Будзем прыцягваць валанцёраў да маніторынгу, — падкрэсліў Сямён Левы. — На жаль, чалавек вельмі моцна паўплываў на зніжэнне папуляцыі гэтых відаў, якія з'яўляюцца індыкатарамі натуральных і малапарушаных экасістэм.

Таксама спецыялісты створаць інтэрактыўную анлайн-карту, дзе любы ахвотны зможа адзначыць новыя месцы пражывання рэдкіх грызуноў. Пасля чаго гэтыя пункты будуць абследавацца і аддавацца пад ахову.

Калі вы заўважыце аднаго з супергрызуноў, калі ласка, напішыце на пошту info@ptushki.org.

**Кацярына ЦІТОВА.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1:
– капитальное строение, инв. № 400/С-6175 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административно-производственный блок), общей площадью 1291,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18, с принадлежностями; капитальное строение, инв. № 400/С-112954 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж), общей площадью 27,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18; капитальное строение, инв. № 400/С-112953 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж), общей площадью 52,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18/1; капитальное строение, инв. № 400/С-112960 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – проходная), общей площадью 24,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18; капитальное строение, инв. № 400/С-112946 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 67,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18; капитальное строение, инв. № 400/С-112949 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 129,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18/2; капитальное строение, инв. № 400/С-125520 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – котельная с подсобным помещением), общей площадью 49,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18/3; капитальное строение, инв. № 400/С-112959 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 105,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18; капитальное строение, инв. № 400/С-112961 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 65,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18; оборудование: газогенераторный котел КВГТ-100 (заводской номер 133), счетчик воды, пожарная сигнализация, РУ-0,4 кВ (панели входные 12 шт.)

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000002003328, площадью 0,5222 га (назначение – земельный участок для обслуживания производственной базы), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 18. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, код – 5,1 площадью 0,0046 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код 5,2 площадью 0,0089 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, код – 5,4 площадью 0,0120 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, код – 5,5 площадью 0,0581 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, код 5,6, площадью 0,0011 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной системы, код – 5,7 площадью 0,0271 га

Начальная цена продажи – 487 130,40 руб. (четыреста восемьдесят семь тысяч сто тридцать рублей сорок копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 24 356 руб. (двадцать четыре тысячи триста пятьдесят шесть рублей)

Продавец – Гродненское областное потребительское общество, 230023, г. Гродно, ул. 1 Мая, д. 28, тел. 72-30-50, факс 72-00-67

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 4 июля 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.03.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 27 июня 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## ОАО «Светлогорскпромстрой» уведомляет о проведении открытых повторных электронных торгов на электронной торговой площадке по реализации имущества по адресу www.torgi.gov.by по продаже имущества

**Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества**

| № лота | Описание | Начальная цена бел. руб. (в том числе НДС 20 %) | Шаг аукциона, (5 %) бел. руб. | Задаток, (10 %) бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Экскаватор колесный ЭО-33211, 2000 год выпуска, двигатель ЯМЗ-238 № 079212360, технически исправен | 5340,00 | 267,00 | 534,00 |
| 2 | Автомобиль грузовой самосвал МАЗ-5551А2, 2008 год выпуска, кузов (рама) Y3M5551A280001318, цвет белый, технически исправен | 12 744,00 | 637,20 | 1274,40 |
| 3 | Автомобиль грузовой бортовой МАЗ-5336А5-320, 2008 год выпуска, кузов (рама) Y3M5336A590000339, цвет белый, технически исправен | 12 246,00 | 612,30 | 1224,60 |
| 4 | Автомобиль грузовой специальный автокран МАЗ-5337 А2 КС-45729А-4-02, 2009 года выпуска, кузов (рама) Y3M4572A490000280/Y3M5337A290001630, цвет желтый, технически исправен | 45 470,00 | 2273,50 | 4547,00 |
| 5 | Автобус-вагон МАЗ 256280, 2008 года выпуска, кузов (рама) Y3M25627080001223, цвет синий, технически исправен | 24 000,00 | 1200,00 | 2400,00 |
| 6 | Автобус специальный фургон ГАЗ-3309 ВМ-32841, 2008 года выпуска, кузов (рама) XWX32841C80000097, цвет белый, технически исправен | 6720,00 | 336,00 | 672,00 |
| 7 | Автомобиль грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 6303 А5 СМБ 372-50, 2010 года выпуска, кузов (рама) Y3BSMB372A0000219, цвет белый, технически исправен | 25 360,00 | 1268,00 | 2536,00 |
| 8 | Автомобиль грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 6303 А3 СМБ 372-30, 2009 года выпуска, кузов (рама) Y3BСМБ37290000097/Y3M6303A390001007, цвет белый, технически исправен | 25 360,00 | 1268,00 | 2536,00 |

**Аукцион состоится 2 июля 2019 года с 8.00 до 16.00 на электронной торговой площадке по адресу www.torgi.gov.by.**

Всю подробную информацию о лотах можно узнать на торговой площадке: **www.torgi.gov.by, в поиске набрав интересующий вас лот.**

Заявки на участие в электронных торгах в виде электронного документа направляются заявителями на электронный адрес centr@economy.gov.by с даты настоящей публикации по 01.07.2019 в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, должно пройти регистрацию на электронной торговой площадке.

Заявитель вправе изменить или отозвать заявку не позднее дня окончания срока подачи заявок, направив организатору электронных торгов уведомление в виде электронного документа.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Продавец: ОАО «Светлогорскпромстрой».

Организатор аукциона: Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Светлогорскпромстрой».

Задаток блокируется в момент первой ставки участника на лот. Участник может отозвать свою ставку (вернуть задаток), только если его ставка «перебита» другой, более высокой, ставкой другого участника. При этом информация о сделанной ставке такого участника остается в системе и сохраняется в протоколе торгов.

Задаток перечисляется на р/с Республиканского унитарного предприятия «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь» BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ» БИК: BELBBY2X УНП: 190318109 ОКПО: 37533622. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № личного кабинета). Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается по окончанию аукциона, в личный кабинет.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победителем электронных торгов в течение пяти дней со дня проведения электронных торгов возмещаются фактические затраты, связанные с их организацией и проведением, согласно прейскуранту находящемуся по ссылке https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx.

Победитель электронных торгов обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения электронных торгов.

В случае если на участие в электронных торгах подана только одна заявка или на электронных торгах не было объявлено ни одной ставки, организатор электронных торгов составляет протокол об объявлении электронных торгов несостоявшимися.

При наличии на электронных торгах только одной заявки организатор электронных торгов направляет по электронной почте единственному участнику предложение о приобретении предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, с указанием срока для возмещения затрат, связанных с организацией и проведением электронных торгов.

Ознакомиться с объектом аукциона можно в дни приема документов на участие в аукционе у продавца. Контактное лицо для осмотра объектов: +375 44 75-65-874, тел./факс 8 (02342) 2-08-08.

С правилами торгов можно ознакомиться по адресу **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

**УНП 300042199**

## ОАО «Нафтан» реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество

| Наименование | Инв. № | Год ввода в эксплуатацию | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| Электродвигатель 1ВАО 315OL-0,38-8У2 | 06270552 | 2007 | 816,00 | 979,20 |
| Распредпункт ПР-24-7214 | 06257060 | 2002 | 215,00 | 258,00 |
| Распредпункт ПР-24-7214 | 06257061 | 2002 | 215,00 | 258,00 |
| Плотномер DM-230.2 | 08158045 | 2009 | 3715,00 | 4458,00 |
| Плотномер DM-230.2 | 08158046 | 2009 | 3715,00 | 4458,00 |
| Цистерна съемная 2 куб. м | 06273326 | 2009 | 6935,83 | 8323,00 |
| Цистерна съемная 2 куб. м | 06273327 | 2009 | 6935,83 | 8323,00 |
| Водонагреватель Электролюкс 6 кВт | 06260225 | 2003 | 13,20 | 15,84 |
| Машина маркировочная ММ-4М | 06270701 | 2007 | 2421,67 | 2906,00 |
| Теплообменник ГКВ-800, Х-106/3 | 06271063 | 2007 | 7600,00 | 9120,00 |
| Холодильник Х-60 | 06267511 | 2005 | 3595,00 | 4314,00 |
| Кондиционер центральный каркасно-панельный КЦКП б/з 920677-1 | 23600279 | 2013 | 2150,00 | 2580,00 |
| Кондиционер центральный каркасно-панельный КЦКП б/з 920677-2 | 23600280 | 2013 | 1241,67 | 1490,00 |

Состояние удовлетворительное.

Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 18 июля 2019 года с пометкой на конверте: «Реализация неликвидов, 18.07.2019».

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.

Контактные телефоны: 8 (0214) 59-87-83, 8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42, 8 (0214) 59-88-01

## К публикации Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» о проведении аукциона на право заключения договов аренды земельных участков в г. Гомеле № 7-А/2019, который состоится 5 июля 2019 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 04.06.2019 г.) добавляется лот № 7 в следующей редакции

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, лет | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Затраты на подготовку документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7 | Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 738 по генплану) | 340100000008002696 | 0,0780 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Ограничений в использовании не имеет. Обременения в виде следов проведения земельных работ (котлована, отвалов грунта) | 99 | 5 366,40 | 200,00 | 2 670,74 |

Лот № 7 выставляется на аукцион повторно, извещение опубликовано 19.04.2019 г. в газете «Звязда»

**Контактный телефон +375 232 30-12-46. Информация размещена на сайте: www.qomeloblzem.by либо geodezcentr.by • УНП 400230163**

**24 июля 2019 г.** **ИЗВЕЩЕНИЕ** **№1-У/2019**

## о проведении открытого аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Наличие обременений | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации, руб. | Ориентировочная сумма возмещения убытков, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | В районе улиц Б. Хмельницкого – 60 лет СССР и магистрали «Север-Юг» | 6,6992 | Право проектирования для строительства многофункционального торгово-развлекательного центра | Водоохранная зона рек и водоемов, зона санитарной охраны 3-го пояса охраны водозабора, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона электрических сетей | Перенос площадки для выгула собак; снос зданий и сооружений; возмещение убытков, приченяемых изъятием земельного участка; обременения в виде автомобильной стоянки, дикорастущей древесно-кустарниковой растительности | 512 675,71 | 25 000,00 | 8 479,85 | 121 084,00 |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельном участке в г. Гомель, предоставляемом в аренду сроком на ***5 лет,*** утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6, № 3–14).
3. **Аукцион состоится 24 июля 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются индивидуальные предприниматели и юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Индивидуальные предпринимпатели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

Необходимые документы:
4.1 заявление на участие в аукционе;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномо ченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 18 июня по 22 июля 2019 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14**

**Контактный телефон +375 232 30-12-46. Информация размещена на сайте: www.qomeloblzem.by либо geodezcentr.by**

# «ЕФРАСІННЯ ШАНАВАЛА ПАМЯЦЬ АБ ІМ ТАКІМ ЧЫНАМ»



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Не так даўно ў Полацку было зроблена ўнікальнае адкрыццё — падземны храм. Думаю, варта расказаць нашым чытачам пра яго больш падрабязна.***

— Падземны храм — гэта сапраўды ўнікальнае архітэктурнае збудаванне, якое не мае аналагаў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Ім падкрэсліваецца індывідуальнасць ідэі прападобнай Ефрасінні Полацкай у будаўніцтве Спаса-Праабражэнскага храма. Мы пакуль не змаглі знайсці нейкіх прамых аналогій нават у візантыйскай архітэктуры, таму не можам сказаць, адкуль гэта прыйшло да нас. Памяшканне падземнага храма было адносна невялікім: яго памер 4,5 метра на 1,5 метра, — зверху перакрытае зводам. Ва ўсходняй частцы захаваўся прастол у алтары. Вяла ў падземны храм спецыяльная лесвіца, часткова ўбудаваная ў зямлю. Цікава тое, што шырыня гэтай лесвіцы прыблізна супадае з шырынёй лесвіцы, якая вяла на хоры ў асноўным храме. Таму можна казаць, што абедзве лесвіцы рабілі адны і тыя ж майстры. Мы аднадумна схіляемся да меркавання, што архітэктурнае рашэнне будынка праектаваў вядомы нам дойлід Іаан. Зверху падземны храм быў перакрыты столлю, знізу зроблена падлога з плінфы. Але ў пэўны момант, верагодна, з-за вільгаці, гэта падлога з плінфы была перакрыта зверху драўлянымі дошкамі. Вядома, самы цікавы момант — аркасолі: гэта такая ніша ў сцяне для таго, каб у ёй было зроблена пахаванне. Адну такую нішу мы якраз знайшлі ў падземным храме. Мяркую, што гэта індывідуальны храм для аднаго чалавека і аднаго пахавання.

***— Ці быў хтосьці ў ім пахаваны?***

— Мы ўскрылі гэтую аркасоль, але яна ўжо была разрабаваная. Дакладней, не разрабаваная, а ўскрытая да нас. Так, да гэтага часу яна была закладзена — значыць, пахаванне зрабілі. Аднак у момант пашкоджання храма гэтую аркасоль разбурылі, парэшткі вынялі для перазахавання. Бо калі б гэта было вандальскае разбурэнне гісторыка-культурнай каштоўнасці, засталіся б пэўныя рэчы, косткі. Тут жа ўсё цалкам чыстае, нічога няма. Таму, хутчэй за ўсё, адбылося мэтанакіраванае выманне парэштаў для таго, каб можна было іх перапахаваць.

***— Калі магло адбывацца перапахаванне?***

— Дакладна сказаць па археалагічным матэрыяле мы, на жаль, не можам. Адзінае, можна меркаваць, што да канца XVII стагоддзя падземнага храма і галерэй ужо не існавала. Прычым відавочна, што канструкцыя самога падземнага храма і таго, што было над ім (памяшканне, багата распісанае фрэскамі) — усё загінула падчас моцнага разбурэння ў пажары. Рэшткі пажарышча, аплаўленыя лісты свінца (іх выкарыстоўвалі для пакрыцця даху) зафіксаваны як цэлыя зліткі: знойдзены адзін зліток вагой амаль 38 кілаграмаў. Відавочна, што быў пажар, аднак сказаць дакладна, калі ён здарыўся, складана — да канца XVII стагоддзя.

***— Ці вядома, для каго было адведзена такое адмысловае месца?***

— Мы лічым, што там быў пахаваны бацька прападобнай Ефрасінні — князь Святаслаў-Георгій. Пра гэта сведчаць знойдзеныя два фрагменты абраза Святога Георгія. Гэта ўжо чацвёртая знаходка падобных абразоў у Полацку. Яна знаходзілася ў алтарнай частцы храма. Для каго Ефрасіння магла будаваць такую грандыёзную падземную канструкцыю, якая не мае аналогій, як не для свайго бацькі? Ён быў спонсарам, падтрымліваў яе ў будаўніцтве і іншых справах. А яна шанавала памяць аб ім такім чынам. Гэта наша меркаванне, іншыя даследчыкі могуць з ім не згаджацца, паколькі мы не знайшлі парэштка. Аднак пра тое сведчыць кантэкст.

***— Ці маюцца нейкія звесткі пра тое, што бацька падтрымліваў духоўную дзейнасць Ефрасінні? Бо з жыцця святой паўстае іншая карціна — родныя былі супраць яе сыходу ў манастыр...***

— Так, бацька вельмі балюча ўспрыняў яе сыход у манастыр. Але потым ён з гэтым пагадзіўся, бо Ефрасіння не проста сышла ў манастыр і стала манахіняй. Яна засталася актыўным палітычным дзеячам — выконвала пэўныя палітычныя функцыі ў Полацкім княстве — яе аўтарытэт быў надзвычай вялікі. Гэта пацвярджае той факт, што яна мела сваю пячатку.

***— Раскажыце пра знойдзены тып пахавання, бо я чую пра такі ўпершыню — каб побач быў алтар і адтуліна для памерлага...***

— Так рабіліся вельмі багатыя пахаванні — або епіскапаў, або манахаў, або князёў. Радавым гараджанам быць пахаванымі такім спосабам наўрад ці дазвалялася б. Калі памерлага туды клалі, сцяна фактычна замуроўвалася, часам яе нават замалёўвалі фрэскамі. Але было вядома, што тут пахаваны такі і такі чалавек.

***— Калі гэта сцяна замуроўвалася, ці працягвалі весці службы ў маленькім храме?***

— Што датычыцца гэтага храма, сам па сабе ён невялікі — накшталт умоўнай хатняй царквы. Не кожны дзень ішла служба, а толькі па нейкіх выключных святах. Магло сабрацца пяць манахінь і разам са святаром яны паміналі спачылага. Такім чынам, гэта не агульны вялікі храм. Хутчэй за ўсё гэта было месца пахавання і ўшанавання памяці.

***— Сённяшнім турыстам трапіць туды не ўдасца?***

— Гэты падземны храм у вельмі дрэнным стане. Можна сказаць, што мы адшукалі руіны. Улічваючы, што яму ўжо 800—900 гадоў, калі мы яго раскапалі, ён быў у вільгаці. Таму, каб пазбегнуць далейшага разбурэння, было вырашана яго закансерваваць як мага хутчэй і зрабіць гэта шляхам зваротнай засыпкі той жа глебы, якую мы вынулі. Такім чынам была зроблена кансервацыя: усталяваныя спецыяльныя падпоркі пад рэшткі скляпенняў, каб яны не абрынуліся да канца, і гэта ўсё засыпана зямлёй. Былі ідэі ўзяць храм пад шкло ці выкарыстаць іншы падобны спосаб. Але гэта надзвычай складана, трэба было б прыстасаваць цэлы паверх, атрымаць вельмі вялікае фінансаванне, каб стварыць спецыяльныя ўмовы для гідраізаляцыі, падтрымання ўзроўню вільгаці, тэмпературнага рэжыму і іншага. Гэта вельмі складана — таму сёння ці ў хуткім часе выканаць не атрымаецца. Каб храм зімой не замярзаў, летам не перасыхаў, было вырашана яго засыпаць. Праз 20—30 гадоў мы сюды зноў вернемся на новы этап рэстаўрацыі храма — такія аб'екты патрабуюць пастаяннай падтрымкі. А зрабіць работу на 100—200 гадоў у нас не атрымаецца. Магчыма, на новым этапе рэстаўрацыі будуць прыняты новыя рашэнні, мы зможам ускрыць храм і зрабіць так, каб ён быў навідавоку.

***— Зразумела, што гэта ўнікальная знаходка. Ці паспелі даць ёй грунтоўную гістарычную ацэнку?***

— Пакуль няма прамых аналогій, адкуль прыйшла такая традыцыя, з якога храма. Гэта будзе асноўнае



Так выглядаў знойдзены падземны храм падчас кансервацыі.

адкрыццё для нас — мы зможам сказаць пра сувязь пэўнага рэгіёна і Полацка. Унікальнасць знаходкі ў тым, што мы ўпершыню ў Полацку знайшлі падземны храм і месца пахавання князя — досыць пэўна пра гэта кажам. Такі выключны выпадак. Бо мы ведаем пра пахаванне літоўскіх князёў, рускіх цароў, польскага караля. А тут выявілася, дзе пахавана значная асоба ў беларускай гісторыі.

***— Раскажыце, якія яшчэ знаходкі былі зроблены?***

— У нас ёсць рэдкая знаходка абразка Святога Георгія — такіх абразкоў існавала няшмат. У Полацку ўпершыню было знойдзена некалькі дэталяў хораса. (Хорас — гэта старажытны падсвечнік, які вывешваўся ў храме, для таго каб ставіць у яго свечкі). Упершыню ў Беларусі знойдзена пакрыццё даху XII стагоддзя — адшукалі цэлы ліст. У нас ёсць унікальны збор фрагментаў фрэсак, якія з'яўляліся роспісам унутры галерэй. Знойдзены фрагмент тынкоўкі з тэкставым роспісам. Усе кавалкі мы збіраем, апрацоўваем — рыхтуем для захавання. Ужо падсумаваны знаходкі 2017 года — там сабрана каля 10 000 фрагментаў з фрэсак. За перыяд раскопак 2018 года іх будзе значна больш. Гэткім падрабязным зборам фрэсак на тэрыторыі Беларусі раней ніхто не займаўся. Такім чынам мы зможам убачыць карціны — толькі трэба правільна скласці ўсе фрагменты.

***— Па сутнасці, гэта кавалкі фрэскі?***

— Кавалкі вапнавай тынкоўкі, якая звонку была распісана фрэскамі. Калі зараз зазірнем у вялікі храм, то ўбачым такія фрэскі на сценах. А калі сцены разбураюцца, тынкоўка асыпаецца. Гэтыя кавалкі былі ў зямлі — у галерэі, прыбудаванай да царквы. Мы капалі пасярод муроў і адшукалі такія фрагменты.

***— Ці ёсць цэльная фрэска, якую ўжо можна ўбачыць, ці хоць бы яе частка?***

— Не, пакуль што пра такое мы сказаць не можам. Для такой справы патрэбен спецыяліст-рэстаўратар, які б гэтым займаўся. У нас такога спецыяліста пакуль няма. Аднак мы часам бачым часткі агульнай кампазіцыі, выявы твараў і нават унікальныя надпісы. Ёсць відавочна рознакаляровыя фрэскі з яркімі сюжэтамі. Наша задача як археолагаў найперш адшукаць і захаваць. А ўжо задача рэстаўратараў — працаваць над склейваннем, фактычна зборкай вялікага пазла.

***— Мабыць, вам патрэбен штатны рэстаўратар?***

— Так, мы над гэтым працуем. Было б вельмі добра, каб у нас быў свой рэстаўратар, які б займаўся менавіта гэтым пытаннем.

***— Вяртаючыся да знойдзенага храма: калі пакуль што не знойдзена аналогій, можа, гэта наша, выключна беларуская прыдумка?***

— Наўрад ці. Бо будаўніцтва ў Старажытнай Русі — Вялікім Ноўгарадзе, Полацку — сягае каранямі ў Візантыю, Балгарыю, Грэцыю.

***— Не так даўно ў сродках масавай інфармацыі паведамлялася пра адшуканы ў рацэ шлем Ізяслава. Як вы пракаментуеце такую знаходку?***

— Гэта сапраўды найунікальнейшая знаходка на тэрыторыі Беларусі, шмат пра яе пісалі. Я б скептычна аднесіўся да таго, што яна з'яўляецца шлемам менавіта Ізяслава. Можна сказаць дакладна, што падобны шлем мог насіць і Ізяслаў, і любы полацкі князь. Шлем вельмі багатага, знатнага чалавека. Але знаходка досыць выпадковая, без культурнага слоя, зробленая не ў помніку, не ў пахаванні. Таму сцвярджаць пра рэч Ізяслава я б не браўся. Адзінае, што даследчыкі, якія гэтым займаліся, зрабілі такую высновў — атрымалася іх версія, іх канцэпцыя, яны не абгрунтоўваюць — знешне гэта таксама пахвальна. Для нас — нацыянальны брэнд, яго піяр. Агулам жа для Усходняй Еўропы такі шлем — унікальная рэч. У вывучэнні гісторыі Беларусі ён знойдзе сваё годнае месца. Хацелася б, вядома, каб больш такіх рэчаў было адшукана на тэрыторыі нашай краіны — але гэта ўжо пытанне аб'ёму саміх раскопак, якіх у нас праходзіць не так шмат. Але перспектыва ёсць, можна знайсці шмат цікавага.

***— Раскажыце пра новы археалагічны сезон. Што капаеце і што спадзяецеся ўбачыць?***

— Сёлета ў нас работы вядуцца на двух участках. Першы — на ўсходнім фасадзе пры алтары храма. Работы там часова завершаны. Пакуль сказаць, што мы знайшлі, дакладна нельга. Другі ўчастак — на заходнім фасадзе пры ўваходзе. Мы выйшлі на сцяну экзанартэкса — прыбудовы да храма. Да канца чэрвеня першыя вынікі па гэтым участку будуць вядомыя. Даследаванні вядуцца не толькі Полацкім дзяржаўным універсітэтам. Далучыўся Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт, а таксама Санкт-Пецярбургскі Эрмітаж. Агулам працуем актыўна — якія будуць адкрыцці, хутка даведаемся.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

**Фота www.psu.by**

Пантэон Айчыны

# Януш Радзівіл

*(1612—1655)*



**У гістарычнай літаратуры склаліся два вобразы Януша Радзівіла. Вядомы польскі пісьменнік Генрык Сянкевіч у славутым рамане «Патоп» паказвае Януша Радзівіла ганарлівым, самалюбівым магнатам, здраднікам Рэчы Паспалітай, які дзеля карыслівых інтарэсаў перайшоў на бок Швецыі. З пункту гледжання польскага пісьменніка, сапраўды, Януш Радзівіл здраднік, але ці здраджваў ён сваёй Айчыне?**

Сучаснікі прызнавалі яго выдатны вайсковы талент: «Лепш за яго ў вядзенні вайны і заключэнні міру ніхто не можа быць здольнейшым». І гэта Януш Радзівіл давёў сваімі перамогамі над украінскімі казакамі, якія нападалі на паўднёвыя і ўсходнія землі ВКЛ, няроўнай барацьбой са шматлікай рацyю цара Аляксея Міхайлавіча.

У маладосці Януш Радзівіл служыў пры двары караля польскага і вялікага князя літоўскага Уладзіслава Вазы. Добрая адукацыя (кальвінскія школы ў Біржах і Кейданах, гімназія ў Слуцку, Лейпцыгскі ўніверсітэт), вайсковы досвед (служба ў войску Генрыха Аранскага і ўдзел у Смаленскай вайне), знатнае паходжанне вылучала маладога Радзівіла сярод каралеўскай світы. Кароль прыхільна ставіўся да яго, не зважаючы на яго кальвінскае веравызнанне. Па сутнасці Радзівіл траціў час на марнатраўства. Выкідваліся грошы на модныя ўборы, на ўпрыгажэнні, на ўтрыманне шматлікіх слуг і асабістага маленькага войска — усяго таго, што мусіла павялічваць бляск князя Радзівіла. Праславіўся ён сваімі скандальнымі словамі: «Прыйдзе той час, калі палякі да дзвярэй не патрапяць, праз вокны іх будзем выкідваць». Можна ўявіць абурэнне палякаў. З гэтага часу яны падазравалі Януша Радзівіла ў патаемным жаданні разарваць унію Польскага Каралеўства і ВКЛ. Магчыма, Януш так і змарнеў бы пры каралеўскім двары, каб кароль не надаў яму пасады польнага гетмана літоўскага. Новыя абавязкі патрабавалі іншага стаўлення да свайго жыцця — сур'ёзнага і адказнага.

**У народнай песні метафарычна расказваецца аб яго вернасці беднай дзяўчыне, якая сімвалізуе гаротную Радзіму.**

Калі ў 1648 годзе на Украіне пачалося паўстанне на чале з запарожскім гетманам Багданам Хмяльніцкім супраць польскай шляхты, яго пажар перакінуўся на Палессе і Падняпроўе. Януш Радзівіл на чале войска ВКЛ ваяваў супраць украінскіх казакаў і мясцовых паўстанцаў — у Мазыры, Тураве, Бабруйску. Януш Радзівіл быў жорсткі не толькі да паўстанцаў, але і да сваіх жаўнераў за непаслушэнства і марадзёрства. Разам з тым ён выказваў клопат пра «ўбогіх хлопкаў» супраць ускладання на іх новых падаткаў і павіннасцяў.

Пад кіраўніцтвам Януша Радзівіла войска ВКЛ 31 ліпеня 1649 года разбіла казацкае войска Міхайлы Крычэўскага ў бітве пад Лоевам і не пусціла яго ўглыб Літвы. Наступным годам войска Радзівіла, разбіўшы казацкія палкі, здзейсніла паход на Украіну і заняло Кіеў.

Нягледзячы на гэтую перамогу, новы кароль Ян Казімір не давяраў Янушу Радзівілу, асабліва пасля таго, як той перастаў падтрымліваць палякаў у вайне з паўсталай Украінай. Ён бачыў, што гэтая вайна вядзе да занепаду як Польшчы, так і Украіны, таму і шукаў міру з Багданам Хмяльніцкім. Аднак той не прымаў яго умовы разарваць саюз з крымскім ханам.

**Кароль надаў яму пасады польнага гетмана літоўскага. Новыя абавязкі патрабавалі іншага стаўлення да свайго жыцця — сур'ёзнага і адказнага.**

Казацкае паўстанне зрэшты перарасло ў вайну Рэчы Паспалітай з Маскоўскім царствам. На ВКЛ рушыла 70-тысячная царская раць. У пераможных рэляцыях царскія ваяводы даносілі свайму гаспадару: «Усіх сяклі ад сэрца», «супраціўных мечу аддалі», «пад меч пусцілі», «пабілі», «высеклі». Гэта было жахлівае крывавае нашэсце, якому, па словах сучасніка, «ни единого несты подобия». Януш Радзівіл меў толькі 11 тысяч жаўнераў і з такімі сіламі не мог стрымаць ворага. «Як справіцца з няроўнымі і такімі вялікімі сіламі? Толькі з адзін без усялякай дапамогі трываю цяперашнюю бяду і ўжо 6 тыдняў на сваіх плячах трымаю такога моцнага непрыяцеля з боку Полацка, Віцебска, Смаленска, Мсціслава, непакоячы яго і замінаючы яго намерам, аднак біць і разбіваць яго не магу», — пісаў каралю Радзівіл.

Нягледзячы на цяжкае становішча, Януш Радзівіл вырашыў біцца з ворагам: «Нічога не возьма без козыра». Ён ішоў насуперак каралеўскаму загаду не ўступаць у бой і не рызыкаваць войскам. Дзеянні Януша называлі вар'яцтвам і тлумачылі гэта яго характарам — «занадта самалюбівы». Яго «самалюбства» — родавая годнасць і высакароднасць, якія не дазвалялі яму, нашчадку чатырох гетманаў і самому ўжо гетману вялікаму і віленскаму ваяводу абняславіць сябе баязлівасцю ці малодушшам. У бітве 24 жніўня 1654 года каля вёскі Шапялевічы на берагах Бярэзіны маскоўскае войска князя Трубяцкога разбіла войска Радзівіла. Сам военачальнік выратаваўся ўцёкамі, але з паражэння ён не рабіў трагедыі. «Няхай Бог судзіць тых, хто выдаў нас і хацеў наўмысна загубіць: адкрыюцца калі-небудзь людскія вочы... А тое, што Бог яшчэ дасць сваё, маю моцную ў тым надзею». Каб апраўдацца ад абвінавачванняў у паражэнні і нават у здрадзе, Януш у кастрычніку на чале сабранага ім 12-тысячнага войска рушыў у контрнаступленне. Перад паходам ён разаслаў універсалы з заклікам сялянам «крепчайший неприятелю тому давать отпор». Паход не прынёс жаданага выніку: хоць і быў вызвалены шэраг гарадоў, але Радзівіл не адваяваў важнейшую цвержу Стары Быхаў і стратэгічна важны Магілёў. Аблогі гэтых гарадоў канчаткова падарвалі сілы войска, і яно ўжо не змагло вясной спыніць імклівы наступ царскіх палкоў. Пасля ўпартых баёў была ўзятая Вільня. Цар пачаў тытулавацца вялікім князем літоўскім, палічыўшы ВКЛ сваім новым уладаннем.

У гэты ж час супраць Рэчы Паспалітай пачала вайну Швецыя. Шведы амаль без супраціўлення занялі палову Польшчы, а большая частка польскай шляхты прысягнула шведскаму каралю Карлу Густаву. Становішча склалася катастрафічнае. «Стуль маскалі, а стуль шведы, дзе падзецца з такой беды?» — казалі на Літве. Януш Радзівіл бачыў выратаванне ВКЛ у шведскай пратэкцыі. «Не аб славе, не аб Рэчы Паспалітай, не аб вольнасці і маёмасці, але аб жыцці справа ідзе. З двайнога зла мусілі выбраць меншае, з плачам развітаўшыся са свабодай Айчыны», — тлумачыў свой выбар Януш Радзівіл. Дзеля справядлівасці адзначым, што прапанова аб уніі паступіла ад шведскага караля. Радзівіл прыняў яе. 18 жніўня 1655 года каля Кейданаў у сваім лагеры Януш Радзівіл з часткай паслядоўнікаў падпісаў са шведскімі камісарамі гэтак званую Кейданскую унію. Януш Радзівіл лічыў яе часовай мерай, палітычным ходам. «У Бога і света адмову мелі, што прынялі тую пратэкцыю, калі нас Літву выдалі і калі маскаль стаяў каля Вільні, чаго Вялікая Польшча не мела, а мы з бяды, да чаго кінуцца мелі? Але яшчэ не канец, ратаваць нас могуць і нам вольна адступіць».

Надзеі Януша на шведаў не спраўдзіліся — яны не сталі ваяваць з Масковіяй. Большая частка жаўнераў пакінула яго, палічыўшы здраднікам. Радзівіл, які падпісваўся «Януш Вялікі князь Літвы» схаваўся ў Тыкоцінскім замку і апынуўся ў аблозе верных каралю войскаў. Тут 31 снежня 1655 года ён і памёр — падазравалі, ад атручвання.

**Выкідваліся грошы на модныя ўборы, на ўпрыгажэнні, на ўтрыманне шматлікіх слуг і асабістага маленькага войска — усяго таго, што мусіла павялічваць бляск князя Радзівіла.**

У адрозненне ад гісторыкаў, у народзе захаваўся светлы вобраз Радзівіла — абаронцы роднага краю ад ворагаў. Народ апяваў яго гераічную смерць ад «белага цара» — «Радзівілаў пакаралі // З плеч галоўку знялі...». У іншай народнай песні метафарычна расказваецца аб яго вернасці беднай дзяўчыне, якая сімвалізуе гаротную Радзіму. І як бы ні ставіліся да яго сучаснікі, ён верыў, што нашчадкі зразумеюць яго і апраўдаюць: «Пакольки час усё адкрые».

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

Сваімі словамі

# З ІЕШЫВЫ ПАЧЫНАЕЦЦА СВЕТ



**Тэма яўрэйскай спадчыны ў Беларусі вельмі шырокая, адразу пра яе не распавядзеш. Калісьці яўрэі складалі даволі значную частку нашага насельніцтва. Але лёс распарадзіўся так, што многія з іх загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны або вярнуліся на сваю гістарычную радзіму ў Ізраіль. Затое іх архітэктурная спадчына засталася тут. І цяпер мы нясём за яе адказнасць.**

У Беларусі можна было б зрабіць цэлыя гістарычныя цэнтры яўрэйскай культуры. Бо мы маем па-сапраўднаму знакавыя для гэтага народа помнікі. Напрыклад, іешыву ў Валожыне — колішнюю вышэйшую духоўную навучальную ўстанову, таксама дом у Вішневе (Валожынскі раён), дзе жыў дзявяты прэзідэнт Ізраіля Шымон Перэс, можна згадаць і Вялікую харальную сінагогу ў Гродне, унікальную барочную сінагогу ў Слоніме. Гэта, як той казаў, толькі вяршкі, і тое павярхоўны іх пералік.

Эксперты сцвярджаюць, што калі б у тую ж валожынскую яўрэйскую спадчыну ўкласці пару мільёнаў долараў — на акуратную, кваліфікаваную рэстаўрацыю, на стварэнне зручнай інфраструктуры і наладжванне пэўнай праграмы — сюды б літаральна пацяклі цэлыя плыні наведвальнікаў-яўрэяў. Прыклад ёсць: у суседняй Украіне маюцца меншыя па значнасці помнікі — але там ладзіцца добра арганізаваны фестываль, таму колькасць турыстаў вельмі істотная. У нас жа, з нашым багаццем, гэтыя лічбы дакладна былі б у разы большыя! І ўсе ўкладзеныя сродкі вярнуліся б даволі хутка. А пасля — такі турыстычны брэнд толькі ўзмацняўся б, прыносячы краіне і прыватным асобам добрыя грошы.



**Валожынская іешыва яшчэ два стагоддзі таму рыхтавала рабінаў, вядомых далёка за межамі Усходняй Еўропы.**

Аднак я не толькі пра фінансавы складнік. Яшчэ пра памяць. Мае знаёмыя набылі неяк сядзібу ў Ашмянскім раёне (гэта не яўрэйская спадчына, проста прыйшлося да слова). І вось кожнае лета, у адзін і той жа дзень, калі раптам знаходзішся ў іх у гасцях, не трэба палохацца, што па тэрыторыі раптам пачынае хадзіць цэлы натоўп упэўненых у сабе людзей, якія пачуваюцца даволі па-гаспадарску. Не, міліцыю выклікаць не трэба, усё ў парадку. Проста родавую сядзібу ў свой час прадалі, але кожны год сваякі збіраюцца разам, прыязджаюць на гістарычную радзіму. Каб наведаць сваё месца сілы, адчуць яго жыццядайную энергію, моц каранёў. І гэтага хопіць на цэлы доўгі год — такія наведванні іх сям'я ніколі не прапускае.

Ступень гістарычнай, нацыянальнай, родавай самасвядомасці ў кожнага розная. Вось у яўрэйскага народа яна надзвычай высокая. І калі б было што паглядзець — прыязджалі б дакладна. Шмат у нас і старых яўрэйскіх могілак, аднак на свае вочы ўбачыць дзе-нідзе занядбанасць — такое вытрымаюць нервы не кожнага замежніка. Трэба зрабіць яшчэ адну важную рэмарку: у Беларусі паступова пачынаецца хваля «добраўпарадкавання» старых могілак: пачынаючы ад Вайсковых у Мінску, яна паступова перабіраецца і ў іншыя рэгіёны. Дык вось, прыборка крышку нахіленых помнікаў, таго, што акурат «дыхае» мінулым і даўнім часам, пра які хочацца ўспамінаць, і замена іх на аднатыпныя падгалоўнікі (характэрныя толькі для новых вайсковых пахаванняў) нічога агульнага з захаваннем гістарычнай памяці не мае. Вельмі не імпануе, калі атрымаецца як у старой прыказцы: хацелі як лепш, а атрымалася... Спрабавалі добраўпарадкаваць, а ў выніку знішчаюцца памятныя адрозненні. Так не павінна быць і, верыцца, што не будзе.

Акрамя фізічнага складніка (грошы), душэўнага (памяць), ёсць яшчэ і духоўны. Згодна з Бібліяй, адночы ўсе народы будуць судзімыя згодна са сваім стаўленнем да «народу Божага». Мне думаецца, што ў беларусаў з гэтым праблем не будзе — хутчэй пахвала. Але вось прыгадалася яшчэ раз пра важнае. Расставіліся некаторыя акцэнты.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Агро-сад Рассвет»

**Предмет торгов: лот –** погрузчик «Амкодор 332С-01», категория – «F», год выпуска 2006 г., регистрационный знак АА 6120, заводской номер 105061282

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без НДС)** | **12 900,00** | **Размер задатка, руб.** | **1 290,00** |
| **Продавец** | ОАО «Агро-сад Рассвет», Брестская обл., аг. Вистычи, ул. Центральная, 22 | | |
| **Организатор аукциона** | Брестский филиал РУП “Институт недвижимости и оценки” | | |
| **Условия продажи** | Без условий | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты Р/сч для перечисления задатка** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |

**Аукцион состоится 19 июля 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию, можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 18 июля 2019 г. до 17.00**

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, **WWW.BELTORGI.BY.**

Продавец: ООО «Ювелирный завод «Эгретт» (УНП 700294886) в лице управляющего по банкротству ИП Мясоедова Руслана Федоровича, тел. +375 29 687 66 09.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **5 июля 2019 г**. с **09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.** Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 27.04.2019 г.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Драгоценные камни (изумруды, бриллианты) в ассортименте | 8 688,02 |
| 2 | Вставки синтетические в ассортименте | 6 822,83 |
| 3 | Серебряные изделия в ассортименте (925 проба) в ассортименте | 29 211,52 |
| 4 | Серебряные изделия (925 проба) в ассортименте | 3 291,19 |
| 5 | Серебряные изделия (925 проба) в ассортименте | 581,79 |
| 6 | Серебряные изделия (925 проба) в ассортименте | 95 752,76 |
| 7 | Золотые изделия (585 проба) в ассортименте | 88 033,76 |
| С полным перечнем предметов торгов можно ознакомиться на beltorgi.by | | |

Местонахождение предметов торгов – г. Могилев, контактный телефон для ознакомления и осмотра +375 29 687 66 09.

**Для участия в торгах необходимо** в срок по 4 июля 2019 г. 17.00: 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение, оплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: унитарное предприятие «Строительно-монтажное управление «ПОДЪЕМ» (УНП 192522108) в лице ликвидатора Региса Алексея Альбертовича, тел. +37529 378-83-88.

Публичные торги в электронной форме будут проведены **19 июля 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

| № п/п | Инв. № | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб., с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | 44072 | Зигмашина И-2714 | 624,00 |
| 2 | 44201 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 7 140,00 |
| 3 | 44204 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 7 140,00 |
| 4 | 44205 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 7 140,00 |
| 5 | 44216 | Лебедка ЛМ-2 | 792,00 |
| 6 | 44224 | Лебедка электрическая 5 тн | 1 656,00 |
| 7 | 47858 | Полуавтомат POWERTEC-505S PRO WATER | 1 572,00 |
| 8 | 47842 | Полуавтомат POWERTEC-500S PRO WATER | 1 572,00 |
| 9 | 47841 | Полуавтомат POWERTEC-500S PRO WATER | 1 572,00 |
| 10 | 47827 | Полуавтомат сварочный POWERTEC-500S | 1 572,00 |
| 11 | 44503 | Полуавтомат сварочный TX 315 | 264,00 |
| 12 | 44144 | Пресножницы Нв-5221 | 2 004,00 |
| 13 | 44132 | Пресс К2320 | 936,00 |
| 14 | 44106 | Пресс-ножницы с-229а | 420,00 |
| 15 | 47864 | Принтер EPSON Stylus Pro 7700 | 2 076,00 |
| 16 | 44049 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 1 092,00 |
| 17 | 44057 | Станок торцефрезерный ТФС-4 | 9 336,00 |
| 18 | 44067 | Станок точильно-шлиф. 3Б632 | 756,00 |
| 19 | 44151 | Станок фальцепрокатный СТД-16А | 1 668,00 |
| 20 | 47892 | Автоматический воздушный компрессор (НТА-120) | 2 568,00 |
| 21 | 572 | Бытовка для рабочих б/у | 2 652,00 |
| 22 | 210103 | Вагон-бытовка | 816,00 |
| 23 | 100359 | Вагон-домик | 3 120,00 |
| 24 | 100406 | Вагон-домик | 744,00 |
| 25 | 141620 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 228,00 |
| 26 | 141621 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 228,00 |
| 27 | 141615 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 228,00 |
| 28 | 141623 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 228,00 |
| 29 | 141624 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 228,00 |
| 30 | 141617 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 228,00 |
| 31 | 141625 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 228,00 |
| 32 | 160603 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 228,00 |
| 33 | 141601 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 228,00 |
| 34 | 141608 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 228,00 |
| 35 | 141609 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 228,00 |
| 36 | 141602 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 228,00 |
| 37 | 141607 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 228,00 |
| 38 | 4020502 | Электростанция ENDRESS ESE 504 DHS (5кВт) бенз. | 1 092,00 |
| 39 | 66 | Станок заточный | 756,00 |
| 40 | 180 | Гибкий эндоскоп ЭТГ 10-1.5 | 1 584,00 |
| 41 | 184 | Твердомер динамический ТЭМП-4 | 348,00 |
| 42 | 185 | Ультразвуковой толщиномер БУЛАТ-1S | 540,00 |
| 43 | 4222 | Кран-балка | 3 564,00 |
| 44 | 1127 | Кран-балка | 1 356,00 |
| 45 | 573 | Приемник П-900 | 708,00 |
| 46 | 147510 | Электронный теодолит АНТОК | 600,00 |
| 47 | 456 | Станок 16к25 | 4 428,00 |
| 48 | 6E+08 | Штангель-циркуль ШЦ-3-2000-0,1 | 936,00 |
| 49 | 4,1E+08 | Машина для обработки кромок ВМ-20 | 912,00 |

Местонахождение – п. 1, 5, 6, 12, 13, 14, 16, 17, 18, 19, 20 – г. Бешенковичи, п. 22, 24, – г. Слуцк, п. 7, 8, 9, 10, 11, 15, 21, 23, 26–49, г. Минск, ул. Вильямса 37а, п. 2, 3, 4 – г. Заславль, телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-18.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 18.07.2019 г. 17.00:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: ООО «МАГНУС групп» (УНП 191112191) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **5 июля 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.** Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 30.03.2019 г.

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Шаг торгов / задаток, бел. руб. |
|---|---|---|
| Полуприцеп MAZ 975830 3016M | 4 500,00 | 225,00 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Солтыса, д. 108, тел. для ознакомления +37529 698 53 53 | | |

**Для участия в торгах необходимо в срок по 04.07.2019 г. 17.00:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, б-р имени Мулявина, 6, код BPSBBY2X, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи

# Извещение о проведении электронных торгов

**Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 10 июля 2019 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by/) проводит электронные торги № 1560236785449 по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске**

**Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет.**

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка / назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
